Аляксандр Цыганкоў

# Уладальнікі Лёзна
# XVI – пач. XX ст.




Лёзна 2022

**Цыганкоў, А.**

Уладальнікі Лёзна XVI – пач. XX ст. / А. Цыганкоў – Лёзна, 2022. – 76 с.

# ЗМЕСТ

ПРАДМОВА ........ 4
Міхаіл Іванавіч Асавіцкі ........ 6
Аграфена Андрэеўна Лукомская ........ 11
Астафій Багданавіч Валовіч ........ 12
Раіна (Рэгіна) Астаф’еўна Валовіч ........ 15
Марцін Янавіч Стравінскі ........ 18
Багдан Мацвеевіч Агінскі ........ 20
Самуэль Багданавіч Агінскі ........ 29
Шыман Караль Агінскі ........ 35
Багуслаў Казімір Агінскі ........ 43
Юзэф Агінскі ........ 48
Ігнацый Агінскі ........ 51
Юзэф Храпавіцкі ........ 53
Антоній, Міхаіл і Яўстафій Храпавіцкія ........ 57
Ігнацый Францавіч Шэбека ........ 65
Аляксандр Ігнацьевіч Шэбека ........ 68
Мікалай Дзмітрыевіч Хлюсцін ........ 72
ЗАКЛЮЧЭННЕ ........ 75

# ПРАДМОВА

Лёзна ўзнікла на землях Мікулінскай воласці не пазней за XVI стагоддзе.

Тапонім з азначэннем “лёзненскі”, а дакладней “лезенскі”, упершыню прыводзіцца ў дзельчым лісце на маёнтак Пагосцішча, складзеным 15 жніўня 1527 г. Пры падзеле ўладання паміж прадстаўнікамі роду Алферавічаў згадваюцца землі “по другой стороне дороги, у верх Ольшы реки ... и по Лезенскую границу ... ”[1]. У падобным дакументе, датаваным 6 сакавіка 1543 г., у якасці размежавальнага знака выступае таксама Лезенская дарога: “а к тому нам досталась зарецкая земля ... у верх по Лезенскую дорогу, а тою дорогою Лезенскою аж до реки до Ольшы”[2]. Прыведзеныя звесткі ўскосна сведчаць пра існаванне Лёзна ўжо ў першай палове XVI стагоддзя.

Найбольш ранняя згадка ў пісьмовых крыніцах самаго населенага пункта адносіцца да 3 красавіка 1593 г. і ўтрымліваецца ў скарзе Марціна Стравінскага на братоў Рамана і Пятра Валовічаў за гвалтоўны захоп маёнтка Мікуліна. У дакуменце гаворыцца, што названыя браты Валовічы наслалі на ўладанне Марціна Стравінскага некалькі соцень узброеных людзей, якія гвалтам выгналі мікулінскага ўрадніка, захапіўшы маёнтак з усімі сёламі і прыселкамі, пры пераліку якіх упершыню называецца Лёзна (“село Лезьно, службъ чотыри зо всими поддаными и з ихъ кгрунты”)[3].

Такім чынам, гісторыя Лёзна налічвае амаль пяць стагоддзяў, і большую яе частку населены пункт меў статус прыватнаўласніцкага мястэчка, гэта значыць, належаў канкрэтнай асобе ці некалькім асобам.

Кім былі ўладальнікі Лёзна? Чым яны адзначыліся ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, у склад якіх у розныя часы ўваходзілі беларускія землі? Якую ролю адыгралі ў развіцці самаго населенага пункта? Адказам на гэтыя пытанні прысвечана прыведзенае ніжэй даследаванне.

---

[1] Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в центральном архиве в Витебске и изданные под редакцией и.д. архивариуса сего архива, М.Веревкина. Выпуск 24, Витебск: Типо-Литография Г.А.Малкина, 1893. С. 249.

[2] *Ibidem,* С. 245.

[3] Историко-юридические материалы … Выпуск 20, Витебск: Типо-Литография Г.А.Малкина, 1890, С. 501-502.

Гісторыя ўладальнікаў Лёзна XVI – пачатку XX стагоддзя да гэтага часу вывучана недастаткова. Найбольш поўныя звесткі па гэтым пытанні прыведзены ў кнізе “Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Лёзненскага раёна”. Паводле іх, Мікулінская воласць, на землях якой ўзнікла Лёзна, у канцы XV стагоддзя знаходзілася пад кіраваннем князя Івана Асавіцкага. Каля 1526 года гэтыя землі былі падараваны яго сыну Міхаілу. Пасля смерці Міхаіла Іванавіча Асавіцкага ў 1550 годзе Мікулін перайшоў да яго жонкі Аграфены Андрэеўны з роду князёў Лукомскіх. У 1555 годзе воласць была падаравана вялікім князем Грыгорыю Валовічу, дачка якога Раіна (Рэгіна) Валовіч выйшла замуж за Багдана Мацвеевіча Агінскага і ўнесла Мікулін у род князёў Агінскіх у якасці пасагу. Ад 1625 года Лёзнам валодаў Самуэль Багданавіч Агінскі, ад 1657 года – яго сын Шыман Караль Агінскі. Пасля смерці Шымана Караля ў 1699 годзе мястэчка было падзелена паміж яго сынамі Багуславам, Марцыянам Міхаілам і Аляксандрам. Звесткі аб уладальніках населенага пункта на працягу XVIII – першай паловы XIX стагоддзя не прыводзяцца. Толькі ў 1870 годзе ад Агінскіх Лёзна перайшло да Храпавіцкіх, потым да палкоўніка Шэбекі[4]. Менавіта гэтыя звесткі сталі зыходным пунктам даследавання.

Храналагічныя межы даследавання ахопліваюць перыяд ад пачатку XVI стагоддзя да 1917 года.

---

[4] Памяць : Гісторыка-дакументальная хроніка Лёзненскага раёна. – Мн.: БелЭн, 1992. С. 27.

# Міхаіл Іванавіч Асавіцкі

Першым вядомым уладальнікам Мікулінскай воласці, на землях якой узнікла Лёзна, з’яўляецца князь Міхаіл Іванавіч Асавіцкі.

Асавіцкія – старажытнарускі княжацкі род, адна з галін роду Рурыкавічаў. Паходзілі ад князёў Чарнігаўскіх.

Пачынальнікам роду Асавіцкіх лічыцца князь Міхаіл Раманавіч, які жыў каля 1263 года.

Дзед Міхаіла Раманавіча – Міхаіл Усеваладавіч Святы – вялікі князь кіеўскі ў 1236-1240 і 1241-1243 гадах, князь чарнігаўскі ў 1242-1246 гадах. У 1246 годзе быў выкліканы ў Арду, аднак, прыбыўшы ў стаўку Батыя, адмовіўся выконваць паганскія абрады, за што прыняў пакутніцкую смерць[5]. Прылічаны да ліку святых Рускай Праваслаўнай Царквы.



*Св. князь Міхаіл Чарнігаўскі на іконе 1688 г.*

Сын Міхаіла Ўсеваладавіча Святога – Раман Міхайлавіч – пасля смерці бацькі княжыў у Бранску, а яго сын – Міхаіл Раманавіч – у сваю чаргу, трымаў невялікі ўдзел бранскага княства Асавік.

*Сёння Асавік – невялікае сяло на поўначы Бранскай вобласці Расіі. Аб часах, калі паселішча было цэнтрам воласці старажытнарускага княства, нагадваюць толькі парэшткі магутнага гарадзішча на беразе р. Дзясна.*

Менавіта Міхаіл Раманавіч стаў пачынальнікам роду Асавіцкіх. Ён памёр рана, яшчэ пры жыцці свайго бацькі. У адпаведнасці з родавым прынцыпам успадкавання, сыны маглі наследаваць толькі землі сваіх бацькоў, таму нашчадкі Міхаіла Раманавіча страцілі права на бранскае княжанне і аказаліся абмежаванымі валоданнем невялікай воласцю Асавік, ад назвы якой і атрымалі сваё прозвішча.

[5] Сказание об убиении в Орде князя Михаила Черниговского и его боярина Феодора // Повести и сказания Древней Руси. Отв. ред. Д. С. Лихачев. СПб. : Диля, 2001, С. 243—247.

У 1356-1359 гадах Бранскае княства было далучана да Вялікага Княства Літоўскага. Так распачаўся беларуска-літоўскі перыяд гісторыі гэтых зямель.

На працягу XIV і большай часткі XV стагоддзя пра князеў Асавіцкіх не захавалася ніякіх звестак. Толькі ў 1482 годзе ў пісьмовых крыніцах згадваецца князь Іван Міхайлавіч Асавіцкі, які атрымліваў 6 коп грошаў з каралеўскага скарбу і 7 – са смаленскай мыты. У 1488 годзе атрымальнікам даходу з каралеўскага скарбу і смаленскай мыты выступае ўжо яго сын князь Міхаіл Іванавіч Асавіцкі[6]. Менавіта ён з'яўляецца першым вядомым уладальнікам Мікулінскай воласці.

Вядома, што Мікулінскую воласць Міхаіл Іванавіч Асавіцкі атрымаў у выслугу – як дараванне за службу вялікаму князю на перыяд жыцця атрымальніка.

У выніку вайны 1500-1503 гадоў Вялікае Княства Літоўскае страціла значную частку сваіх усходніх тэрыторый, у тым ліку бранскія землі. Пад кантролем Маскоўскай дзяржавы апынулася і родавыя ўладанні князёў Асавіцкіх. У падобных абставінах большасць князёў рускага паходжання пераходзіла на службу да маскоўскага ўладара, аднак Міхаіл Іванавіч захаваў вернасць вялікаму князю літоўскаму.

На гэтым страты князя Асавіцкага не скончыліся. У ходзе вайны 1512-1522 гадоў пад кантролем Маскоўскай дзяржавы апынуліся таксама землі Мікулінскай воласці.

Такім чынам, усе ўладанні князя Асавіцкага былі занятыя непрыяцельскімі войскамі, і ён застаўся без сродкаў для пражытку.

Наўзамен страчаных уладанняў Міхаіл Іванавіч Асавіцкі атрымаў ад вялікага князя літоўскага Жыгімонта І Старога ў 1512-1515 гадах маёнтак Ірава (Юраў) у Кіеўскім павеце, уласнік якога князь Багдан Фёдаравіч Глінскі ад 1500 году знаходзіўся ў маскоўскім палоне. Акрамя гэтага, у 1515 годзе вялікі князь надаў Міхаілу Іванавічу Асавіцкаму дзяржаўнае ўладанне Дарсунішкі ў Троцкім ваяводстве, якое ў 1517 годзе замяніў на дзяржаву Скерстымонскую, а да 1525 года – на дзяржаву Ясвойнскую ў Жамойці[7].

[6] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / Warszawa : Drukiem J. Filippowicza, 1895. S. 341.
[7] *Ibidem,* S. 341.

Па ўмовах замірэння з Маскоўскай дзяржавай у 1522 годзе пад кантроль Вялікага Княства Літоўскага была вернута Мікулінская воласць[8].

Такім чынам, да сярэдзіны 1520-х гадоў маёмаснае становішча князя Асавіцкага значна палепшылася: ён трымаў Ясвойнскую дзяржаву ў Жамойці, Мікулінскую воласць у Віцебскім павеце, а таксама маёнтак Ірава ў Кіеўскім павеце.

Аднак гэта не было аднойчы і назаўжды ўстаноўленым. На Ясвойнскую дзяржаву прэтэндаваў таксама Іван Цімафеевіч Юрлоў – прадстаўнік маскоўскай знаці, які перайшоў на службу да вялікага князя літоўскага. Менавіта ён быў ясвойскім намеснікам да перадачы ўладання князю Асавіцкаму.

Яшчэ ў 1525 годзе Іван Цімафеевіч Юрлоў атрымаў ад вялікага князя "экспектатыву" – прывілей-абяцанне на валоданне Ясвойнскай дзяржавай пасля смерці Міхаіла Іванавіча Асавіцкага. Аднак не задаволіўся гэтым і дамогся таго, што сама каралева Бона Сфорца і вышэйшыя службовыя асобы Вялікага Княства Літоўскага прасілі Жыгімонта І Старога перадаць яму Ясвойні.

Вынікам намаганняў Юрлова стала тое, што ў 1526 годзе вялікі князь было адабраў у Міхаіла Асавіцкага Ясвойні, матывуючы гэта тым, што ён "вси именья и волости князя Богдана Путилвского держить, а к тому волость его Микулино, которую был взялъ великий князь Московский, и тая волость тепер в нашу сторону отошла, и тую волость свою он жо держить … и мает се на чом поживити"[9].

На гэта Міхаіл Іванавіч Асавіцкі ўказаў, што не вызваліўшы ад непрыяцеля яго спадчынных уладанняў, вялікі князь не павінен адбіраць у яго Ясвойні. Да таго ж, адносна Мікуліна і маёнткаў князя Багдана Глінскага ён заўважыў, што з іх не мае чым пажывіцца, "бо Микулин волостъка мала, а от неприятеля нашого Московского скажона, а тыи именья князя Богдановы у Киевскомъ повете от поганства татар спустошоны"[10].

Па выніках разгляду гэтага звароту Жыгімонт І Стары адмяніў сваё папярэдняе рашэнне, пацвердзіўшы права Міхаіла Асавіцкага на

[8] Сборник Императорского русского исторического общества. Том 35. СПб.: Типография Елеонского и К°, 1882. С. 621-642.

[9] Известия Императорского Томского университета. – Кн. 21, - Томск : Паровая типо-литография П.И.Макушина, 1902. С. 13-14.

[10] Известия Императорского Томского университета. – Кн. 48, - Томск : Типо-литография Сибирск. Т-ва печати, 1910. С. 9-10

валоданне дзяржавай Ясвойні: “паметуючи на верныи заслуги его, ижъ онъ, оставивъши отчизну свою, замки и волости у неприятеля нашого Московского, а самъ, приехав к намъ, гасподару своему прирожоному, а звлаща не мает ся на чом тепер поживити ... тот двор наш Ясвоини ему … держати ... аж до его живота”[11].

У 1531 годзе князь Міхаіл Іванавіч Асавіцкі ініцыяваў судовую справу аб парушэнні яго правоў на валоданне Мікуліным. Ён скардзіўся вялікаму князю на віцебскага баярына Міхаіла Курэйшава, уладальніка Веляшкоўскага маёнтка, за захоп Мікуліна і многія іншыя крыўды.

Справу разглядаў віцебскі ваявода Ян Глябовіч. У ходзе разбіральніцтва было ўстаноўлена, што Міхаіл Асавіцкі і Міхаіл Курэйшаў па-рознаму вызначалі межы сваіх уладанняў і абвінавачвалі адзін аднаго ў іх парушэнні. Князь Міхаіл Іванавіч Асавіцкі называў мяжу паміж уласным маёнткам Мікуліным і Веляшкоўскім маёнткам Міхаіла Курэйшава “праз жывую ваду раку Велімец і праз мох, Трышчал ручай, і праз раку Мародзіню і праз ручай, і праз мох і праз раку Нівенку і ручай Караваці і праз раку Каравяк, і раку Машну, і раку Сукромлю”, а Міхаіл Курэйшаў – “ад Ляхавіка і ад княжых людзей ад Чыстомля ракі, Малаю Ніўніцаю рэчкай уверх, а сышоўшы Малую Ніўніцу рэчку на камень на сухім беразе, ад каменя таго на машок на каменец на тым машку, на каменцы ляжыць камень вялікі, ад таго каменя вялікага праз Вялікую Ніўніцу рэчку на Смородзіню рэчку, а ад Смародзіні рэчкі на ліхую гразь, што да Ляхавіка ходзяць, а там Чыстомлею ракою ўніз сышоўшы по Сукромлю раку”. Абодва бакі прасілі, каб ваявода выехаў на тыя землі і ўстанавіў справядлівыя межы паміж імі[12].

Чым скончылася гэта справа невядома, аднак у 1546 годзе князь Міхаіл Іванавіч Асавіцкі ўзнаўляў разбіральніцтва пра крыўды ў Мікуліне з Міхаілам Курэйшавым[13].

Як ужо згадвалася, ад 1515 года Міхаіл Іванавіч Асавіцкі валодаў маёнткамі князя Багдана Фёдаравіча Глінскага ў Кіеўскім павеце. Сам Багдан Фёдаравіч памёр у маскоўскім палоне ў 1509 ці 1512 годзе, аднак у 1532 годзе з Масквы вярнуўся яго сын Уладзімір Багданавіч Глінскі, які запатрабаваў перадачы яму бацькоўскай спадчыны.

Страта Ірава (Юрава) была для князя Асавіцкага настолькі значнай, што ён падкупіў князя Пятра Капусту, які распаўсюджваў фальшывыя

---

[11] *Ibidem,* С. 10.

[12] Беларускі архіў. Том 2. Літоўская метрыка (XV—XVI ст.) / Склад., уступ. арт. З. Даўгяла. – Мінск : Інстытут беларускай культуры, 1928. — С. 65-66.

[13] Известия Императорского Томского университета. – Кн. 21 … С. 360-361.

звесткі аб тым, што Уладзімір Глінскі не з’яўляецца сынам князя Багдана Фёдаравіча Глінскага, а толькі нейкага Васіля з Вялікіх Лук.

Даказаўшы сваё паходжанне ад князя Глінскага, а таксама той факт, што Пётр Капуста распаўсюджваў фальшывыя звесткі пра яго з прычыны подкупу князем Асавіцкім, князь Уладзімір Глінскі атрымаў каралеўскі ліст, які забараняў пад пагрозай кары шкодзіць яго добрай славе[14].

У 1533 годзе Міхаіл Іванавіч Асавіцкі быў вымушаны, супраць уласнай волі, вярнуць Уладзіміру Багданавічу Глінскаму маёнтак Ірава.

Акрамя прыведзеных фактаў, пра Міхаіла Іванавіча Асавіцкага вядома, што ён вызнаваў праваслаўе, быў жанаты на княжне Аграфене Андрэеўне Лукомскай, дзяцей не меў[15].

Узнаўленне ў 1546 годзе разбіральніцтва з Міхаілам Курэйшавым пра крыўды ў Мікуліне было апошняй прыжыццёвай згадкай князя Асавіцкага. Неўзабаве пасля гэтага ён памёр. Пахаваны ў царкве св. Прачыстае (сёння – праваслаўны Кафедральны сабор) у Вільні[16].



*Прачысценскі кафедральны сабор у Вільні*

[14] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 88.
[15] *Ibidem,* S. 342.
[16] *Сліж Н.* Лёс дзяцей Івана Гарнастая, падскарбія ВКЛ // Беларускі гістарычны зборнік. Вып. 39. Беласток: Беларускае гістарычные таварыства, 2013. С. 51.

# Аграфена Андрэеўна Лукомская



Пасля смерці князя Міхаіла Іванавіча Асавіцкага Мікуліным працягвала валодаць яго жонка Аграфена Андрэеўна Лукомская[17].

Лукомскія – княжацкі род старажытнарускага ці літоўскага паходжання. Сваё прозвішча атрымалі ад назвы горада Лукомль[18].

Неўзабаве пасля смерці першага мужа Аграфена Андрэеўна Лукомская паўторна пабралася шлюбам з каралеўскім дваранінам Сяменам Кмітам.

У тэстаменце (духоўным завяшчанні), складзеным 1 лістапада 1554 г., двор пад Вільняй на рацэ Аліне, а таксама дом у горадзе прызначала другому мужу Сямёну Кміце, маёнтак Пышна ў Полацкім павеце – роднаму брату Андрэю Андрэевічу Лукомскаму. У дакуменце асобна адзначалася, што Мікулін, як выслуга першага мужа Міхаіла Іванавіча Асавіцкага, дадзены ёй пажыццёва, павінен быць вернуты вялікаму князю.

У хуткім часе памерла. Ужо ў сакавіку 1555 года паміж Андрэем Андрэевічам Лукомскім і Сяменам Кмітам была заключана згода пра падзел яе спадчыны.

У 1557 годзе Сямен Кміта адпісаў двор пад Вільняй на рацэ Аліне свайму сыну Філону Кміце-Чарнобыльскаму і яго жонцы Настассі, дачцэ Івана Гарнастая, выяводы навагародскага[19].

У адпаведнасці з тэстаментам, Аграфена Андрэеўна Лукомская была пахавана каля першага мужа ў царкве св. Прачыстае ў Вільні[20].

Пасля яе смерці маёнтак Мікулін перайшоў да Валовіча.

---

[17] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 342.
[18] Сёння Лукомль – аграгарадок, цэнтр сельскага савета Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці.
[19] *Ibidem,* S. 218.
[20] *Сліж Н.* Лёс дзяцей Івана Гарнастая ... С. 51.

## Астафій Багданавіч Валовіч



Пасля смерці княжны Аграфены Андрэеўны Лукомскай у 1555 годзе Мікулін перайшоў да Валовіча.

На падставе звестак аб тым, што ў далейшым Раіна (Рэгіна) Грыгор'еўна Валовіч унесла Мікулін мужу Багдану Мацвеевічу Агінскаму, была прапанавана вельмі простая і лагічная схема пераходу права ўласнасці на маёнтак: ад Міхаіла Іванавіча Асавіцкага і яго жонкі Аграфены Андрэеўны Лукомскай да Грыгорыя Багданавіча Валовіча, і далей, у якасці пасагу яго дачкі Раіны (Рэгіны), да Багдана Мацвеевіча Агінскага[21].

Аднак вядомыя факты не дазваляюць прыняць гэту схему. Так, у кнізе запісаў № 35 Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага прыведзены Прывілей Астафію Валовічу на воласць Мікулін у Віцебскім павеце. У дакуменце гаворыцца, што раней воласць Мікулін у Віцебскім павеце трымаў князь Міхаіл Асавіцкі, а па ім яго жонка. Пасля таго, як яны памерлі, воласць была вернута вялікаму князю. Прывілеем, датаваным 26 сакавіка 1555 г., Жыгімонт ІІ Аўгуст надаў Мікулінскую воласць у Віцебскім павеце “з людзьмі і землямі, з барамі, з лясамі, з сенажацямі, з ловамі звярынымі і птушынымі, з рэкамі, з азёрамі, з рыбнымі ўваходамі і з бабровымі гонамі, а таксама службамі і падачкамі тых людзей” Астафію Валовічу ў вотчыну (спадчыннае ўладанне). Ён сам, а па ім яго жонка і дзеці, і потым іх будучыя нашчадкі павінны трымаць гэту воласць “вечна і навекі непарушна” [22].

У 1581-1582 гадах Астафій Валовіч выдаў прывілей на гандаль, які з'яўляецца першым пісьмовым сведчаннем пра Мікулін як мястэчка[23].

Да таго ж, мікулінскі маёнтак згадваецца ў тэстаменце (духоўным завяшчанні) Астафія Валовіча[24].

---

[21] Памяць : Гісторыка-дакументальная хроніка Лёзненскага раёна … С. 27.

[22] Дакументы па гісторыі Віцебска і Віцебскага павета ў кнізе запісаў № 35 Метрыкі ВКЛ / Андрэй Мяцельскі // Гадавік Цэнтра Беларускіх Студыяў / Варшаўскі Універсітэт, Студыюм Еўропы Усходняй. – 2017. – № 3. – С. 333-334.

[23] *Alexandrowicz St.* Geneza i rozwoj sieci miasteczek Białorusi i Litwy do połowy XVII w. // Acta Baltico-Slavica VII, Białystok, 1970. S. 100.

Такім чынам, менавіта Астафій Валовіч быў уладальнікам Мікулінскай воласці ад 1555 года.

Астафій Багданавіч Валовіч – найбольш знакаміты прадстаўнік свайго роду і адзін з самых выбітных дзяржаўных дзеячаў у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Валовічы – беларускі праваслаўны шляхецкі род з Гродзеншчыны. Пачынальнікам роду лічыцца Грынька Ходкавіч Валовіч, канюшы літоўскі і гараднічы гродзенскі, які жыў у другой палове XV стагоддзя. Яго сын Багдан Грынькавіч Валовіч займаў пасаду канюшага і войскага гродзенскага, меў двух сыноў: Грыгорыя і Астафія.

Дзякуючы незвычайнаму таленту і выключнаму розуму Астафій Багданавіч Валовіч здолеў дасягнуць найвышэйшых дзяржаўных пасадаў у Вялікім Княстве Літоўскім. Распачаўшы кар’еру ў канцылярыі віленскага ваяводы Яна Глябовіча, хутка ўзнімаўся па службовай лесвіцы: ад 1551 года – пісар літоўскі, ад 1561 – маршалак дворны і падскарбі земскі, ад 1566 – падканцлер, ад 1569 – кашталян троцкі і, нарэшце, ад 1579 года – кашталян віленскі і вялікі канцлер літоўскі. Быў апроч гэтага ў розныя гады падстарастай берасцейскім, дзяржаўцай і старастай медніцкім, старастай магілеўскім, азярышчанскім, берасцейскім, кобрынскім і рэчыцкім[25].

Праз усё жыццё рашуча адстойваў інтарэсы і незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага.

У 1553 годзе ўдзельнічаў у пасольстве ў Маскву, дзе ўпарта адмовіўся называць Івана IV Жахлівага “царом усяе Русі”. Нягледзячы на гэта, дамогся заключэння дамовы аб падаўжэнні замірэння з Маскоўскай дзяржавай.

У 1554-1557 гадах прымаў актыўны ўдзел у правядзенні аграрнай рэформы, быў адным са стваральнікаў “Уставы на валокі”.

З’яўляўся адным са складальнікаў Статута Вялікага Княства Літоўскага 1566 года. Менавіта па ініцыятыве Астафія Валовіча ў яго быў уключаны артыкул, які забараняў замежнікам набываць землі і займаць пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім.

---

[24] *Wasilewski T.* Testament Ostafiego Wollowicza // Odrodzenie i Reformacja w Polsce, T. 7, 1962. S. 171.

[25] Вялікае княства Літоўскае : Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1 : Абаленскі – Кадэнцыя. – 2-е выд. – Мінск : БелЭн, 2007. С. 382-383

Выступіў рашучым праціўнікам Люблінскай уніі. Пакінуўшы сойм у лютым 1569 года, рассылаў адозвы на Падляшша і Валынь з заклікам да змагання супраць уніі.

Перайшоў з праваслаўя ў пратэстантызм, быў перакананы прыхільнікам кальвінізму. З'яўляўся адным з апекуноў рэфармацыйнага руху ў Вялікім Княстве Літоўскім. На сродкі Астафія Валовіча была заснавана друкарня ў Нясвіжы. Менавіта яму Сымон Будны прысвяціў кнігу "Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам", выдадзеную ў 1562 годзе.



*Партрэт Астафія Валовіча*

Ад жонкі Теадоры (Фядоры) Сапяжанкі, дачкі Паўла Іванавіча Сапегі, ваяводы новагародскага, меў адзіную дачку Раіну (Рэгіну)[26].

Памёр у снежні 1587 года ў Сандаміры па дарозе ў Кракаў на каранацыю Жыгімонта III Вазы[27]. Пахаваны ў Сідры[28] ў склепе пабудаванага ім кальвінісцкага збору, які да нашага часу не захаваўся.

Пасля смерці Астафія Багданавіча Валовіча яго маёмасць перайшла да адзінай дачкі Раіны (Рэгіны).

---

[26] *Żychliński T.* Złota księga szlachty polskiej. T. XI. – Poznań, 1889. S. 259-264.
[27] *Wasilewski T.* Testament Ostafiego Wołłowicza … S. 165.
[28] Сёння Сідра – вёска ў Сакульскім павеце Падляшскага ваяводства ў Польшчы.

# Раіна (Рэгіна) Астаф’еўна Валовіч

Раіна (Рэгіна) Астаф’еўна Валовіч – адзіная дачка і спадчынніца Астафія Багданавіча Валовіча, канцлера вялікага літоўскага, і Теадоры (Фядоры) Сапяжанкі.

14 мая 1570 г. у Берасці пабралася шлюбам з Севярынам Бонарам, старастай рабштынскім[29].

У адпаведнасці з тэстаментам (духоўным завяшчаннем) бацькі Астафія Багданавіча Валовіча, складзеным 1 снежня 1587 г. у Мілейчыцах[30], атрымала па ім велізарную спадчыну[31].

Памерла 24 чэрвеня 1591 года[32].

Севярын Бонар – сын Севярына Бонара, барона Свяшчэннай Рымскай імперыі, каралеўскага банкіра, бургграфа кракаўскага, старасты бецкага[33], і Ядвігі Касцелецкай.

У 1564 годзе атрымаў пасаду старасты рабштынскага, ад 1589 года – кашталян бецкі, ад 1591 года – кашталян кракаўскі.

Вызнаваў кальвінізм, быў патронам прынамсі 7 кальвінскіх збораў.

Памёр неўзабаве пасля жонкі 23 красавіка 1592 года. Пахаваны ў родавай капліцы Бонараў у касцёле ў Крамолаве[34].

*Каталіцкі касцёл у Крамолаве быў узведзены на мяжы XII і XIII стагоддзяў. У XVI стагоддзі перабудаваны ў стылі барока. Пасля смерці ўладальніка Крамолава Севярына Бонара (бацькі) у 1549 годзе, яго другая жонка Ядвіга Касцелецкая, перадала касцёл кальвіністам каля 1551 года. Па яе ініцыятыве з паўднёвага боку да касцёла была прыбудавана капліца, пад якой уладкавана крыпта-пахавальня роду Бонараў. Каля 1594 года касцёл у Крамолаве быў вернуты каталікам.*

*Паводле апісання з сярэдзіны XVIII стагоддзя капліца Бонараў знаходзілася ў жаласным стане: над ёй не было даху, жалезныя дзверы, што вялі ў крыпту былі вырваны, пахаванні знішчаны, косці Севярына Бонара параскіданы. Сёння памяшканне капліцы выкарыстоўваецца для захоўвання касцельных рэчаў.*

---

[29] Сёння Рабштын – вёска ў Алькушскім павеце Малапольскага ваяводства Польшчы.
[30] Сёння Мілейчыцы – вёска Семятыцкага павета Падляскага ваяводства Польшчы.
[31] *Wasilewski T.* Testament Ostafiego Wołłowicza … S. 168.
[32] *Ibidem,* S. 168.
[33] Сёння Беч – горад у Гарліцкім павеце Малапольскага ваяводства Польшчы.
[34] Сёння Крамолаў – частка горада Заверце Сілезскага ваяводства Польшчы.

Раіна (Рэгіна) Валовіч і Севярын Бонар дзяцей не мелі. Пасля іх смерці маёмасць Астафія Багданавіча Валовіча ўспадкавалі сыны яго роднага брата Грыгорыя Багданавіча Валовіча: Раман, стараста рагачоўскі, і Пётр, чашнік літоўскі.



*Касцёл Святога Мікалая ў Заверці (Польшча)*

Родным братам Астафія Валовіча быў Грыгорый Багданавіч Валовіч – дваранін гаспадарскі ад 1548 года, гараднічы гродзенскі ад 1558 года, маршалак гаспадарскі ад 1560 года, лоўчы вялікі літоўскі ад 1567 года, і, нарэшце, ваявода смаленскі ад 1571 года. У розныя гады быў таксама старастай мсцібаўскім, слонімскім, мілецкім, дзяржаўцай эйжыцкім, каняўскім, варнянскім, дубіцкім, зэльвенскім, даўгоўскім, пралайскім і мерацкім[35].

Менавіта Грыгорыю Багданавічу Валовічу ў снежні 1558 года было даручана правесці рэвізію скарбовай лясной гаспадаркі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Мерапрыемства мела на мэце не толькі дакладнае апісанне межаў дзяржаўных пушчаў і лясоў, але і прыняцце захадаў па іх больш эфектыўнаму выкарыстанню: рэвізор павінен быў вызначыць месцы, прыдатныя для заснавання гарадоў і сёл, узвядзення двароў для арганізацыі велікакняжацкіх паляванняў[36].

У 1563-1564 гадах Грыгорый Багданавіч Валовіч удзельнічаў у пасольстве вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста да маскоўскага цара Івана IV Жахлівага. Дыпламатычная місія адбывалася ў складаных умовах: ад 1558 года Вялікае Княства Літоўскае і Маскоўская дзяржава знаходзіліся ў стане вайны. Пасольства не прывяло да значных вынікаў, аднак садзейнічала належнай падрыхтоўцы Вільні да ваеннай кампаніі 1564 года і аднаўленню раўнавагі сіл на першым этапе Лівонскай вайны.

Перайшоў з праваслаўя ў кальвінізм.

Ад першай жонкі, імя якой невядома, меў трох сыноў: Юзэфа, Рамана, Пятра, і дачку Раіну (Рэгіну). За другую жонку меў Кацярыну Юрлоўну, дачку Івана Цімафеевіча Юрлова, ўдаву па князі Мацвеі Багданавічы Агінскім. Дзяцей з ёй не пакінуў.

Памёр у 1577 годзе.

Менавіта сыны Грыгорыя Багданавіча Валовіча: Раман, староста рагачоўскі, і Пётр, чашнік літоўскі, (трэці сын Юзэф да гэтага часу памёр) успадкавалі маёмасць Астафія Багданавіча Валовіча пасля смерці яго адзінай дачкі Раіны (Рэгіны) у 1591 годзе.

---

[35] *Żychliński T.* Złota ... S. 257-258.

**[36]** Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великом княжестве Литовском, с присовокуплением грамот и привилегий на входы в пущи и на земли, составленная старостою Мстибоговским Григорием Богдановичем Воловичем в 1559 году. Вильна, 1867. 381 с.

# Марцін Янавіч Стравінскі



Са скаргі на братоў Рамана і Пятра Валовічаў за гвалтоўны захоп Мікуліна вядома, што менавіта Марцін Стравінскі быў уладальнікам маёнтка да пачатку красавіка 1593 года [37].

Марцін Янавіч Стравінскі – дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, ротмістр, каралеўскі дваранін, цівун і гараднічы троцкі, войт магілёўскі, маршалак гаспадарскі, кашталян мінскі і віцебскі.

Прадстаўнік шляхецкага роду Стравінскіх з Мазыршчыны, з якога паходзіць выбітны кампазітар Ігар Стравінскі.

Цівун і гараднічы троцкі ад 1576 года[38]. У 1580 годзе атрымаў пасаду маршалка гаспадарскага. У 1590 годзе прызначаны кашталянам мінскім, у 1592 годзе – кашталянам віцебскім[39].

Пазычаў пэўную суму грошаў каралю Стэфану Баторыю на вядзенне Лівонскай вайны, за што атрымаў у заставу даходы ад Магілева.

Быў евангелікам.

Меў трох родных братоў: Бальтазара, пазнейшага ваяводу мінскага, Эразма, палкоўніка, які восем год правёў у маскоўскім палоне, падкаморага ноўгарад-северскага, і Крыштафа, суддзю земскага троцкага.

Быў жанаты з Даміністрай Копаць. Меў з ёй сына Гераніма Максімільяна, старасту рагачоўскага, і дачку Соф'ю, якая выйшла замуж за Рыгора Іванавіча Сапегу, падкаморага аршанскага.

Абставіны пераходу права ўласнасці на Мікулін да Марціна Стравінскага невядомыя. Верагодна, ён адбыўся пасля смерці Астафія Валовіча ў 1587 годзе і яго адзінай дачкі Раіны (Рэгіны) у 1591 годзе. Аднак са стратай маёнтка не пагадзіліся родныя пляменнікі Астафія Валовіча: Раман і Пётр Грыгор'евічы Валовічы.

---

[37] Историко-юридические материалы … Выпуск 20, С. 501-502

[38] *Лаппо И.И.* Великое Княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569-1586). Опыт исследования политеческого и общественного строя. Том. 1. – С.-Петербург : Типография И.Н.Скороходова, 1901. С. 311.

[39] Вялікае княства Літоўскае : Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2 : К – Я. – 2-е выд. – Мінск : БелЭн, 2007. С. 636

У скарзе Марціна Стравінскага гаворыцца, што названыя браты Раман і Пётр Валовічы 3 красавіка 1593 г. наслалі на маёнтак Мікуліна ў Віцебскім ваяводстве некалькі соцень узброеных людзей на чале з Аляксандрам Сколкам, якія выгналі служылых людзей Марціна Стравінскага, гвалтам захапіўшы маёнтак з усімі сёламі, прыселкамі, падданымі і іх землямі. Менавіта ў гэтым дакуменце, сярод прыналежных Мікуліну сёл, упершыню згадваецца Лёзна. Чым скончылася разбіральніцтва справы невядома[40].

У 1594 годзе Марцін Стравінскі памёр[41].

---

[40] Историко-юридические материалы … Выпуск 20, С. 501-502

[41] Вялікае княства Літоўскае : Энцыклапедыя. У 2 т. … С. 636

# Багдан Мацвеевіч Агінскі



У Рамана і Пятра Грыгор’евічаў Валовічаў маёнтак Мікулін набыла родная сястра Раіна (Рэгіна), якая ўнесла яго свайму мужу Багдану Мацвеевічу Агінскаму[42].

Агінскія – знакаміты княжацкі род, пачынальнікам якога быў Дзмітрый Іванавіч Глушонак – прадстаўнік смаленскай галіны Рурыкавічаў.

Дзмітрый Іванавіч атрымаў ад вялікага князя літоўскага Аляксандра маёнтак Агінты[43] ў Жамойці. Яго сын Багдан Дзмітрыевіч карыстаўся яшчэ толькі родавым прозвішчам Глушонак, аднак ужо яго нашчадкі ад 1555 года выступаюць у дакументах як Агінскія[44].

Мацвей Багданавіч Агінскі – старэйшы сын Багдана Дзмітрыевіча Глушонка, цівун віленскі ад 1559 года. Быў жанаты на Кацярыне Іванаўне Юрлоўне, дачцэ Івана Цімафеевіча Юрлова. Меў двух сыноў: Багдана і Яна, і чатырох дачок, з якіх вядомы Кацярына, Ганна і Настасся.

Памёр у 1565 годзе[45].

Неўзабаве пасля смерці першага мужа Кацярына Юрлоўна паўторна пабралася шлюбам з Грыгорыем Багданавічам Валовічам – лоўчым вялікім літоўскім, пазней – ваяводам смаленскім. Паўторна аўдавела ў 1577 годзе.

Сын Кацярыны Юрлоўны ад першага шлюбу Багдан Мацвеевіч Агінскі ажаніўся з дачкой яе другога мужа Раінай (Рэгінай) Грыгор’еўнай Валовіч, якая пазней набыла ў пераемнікаў Астафія Багданавіча Валовіча Мікулін і ўнесла яго ў род Агінскіх.

Такім чынам, менавіта Багдан Мацвеевіч з’яўляецца першым уладальнікам Мікуліна з роду Агінскіх.

---

42 *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 295.
43 Сёння Агінты (Uogintai) – вёска Кайшадорскага раёна ў Каўнаўскім павеце Літвы.
44 *Ibidem*, S. 288-289.
45 *Ibidem*, S. 293.

Багдан Мацвеевіч Агінскі – дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, ротмістр, пазней палкоўнік, падкаморы троцкі, дзяржаўца кармялоўскі і дарсунішскі.

Нарадзіўся ў 1550 ці 1551 годзе. Старэйшы сын Мацвея Багданавіча Агінскага, цівуна віленскага, і Кацярыны Іванаўны Юрловай.

У чыне ротмістра[46] прымаў удзел у падзеях завяршальнага этапу Лівонскай вайны. Вызначыўся ўжо ў бітве пад Гданьскам 1577 года. Удзельнічаў у трох паходах Стэфана Баторыя супраць Маскоўскай дзяржавы: узяцці Полацка ў 1579 годзе, Вялікіх Лук у 1580 годзе і аблозе Пскова ў 1581 годзе. Падчас кампаніі 1581 года прымаў удзел у легендарным паходзе Крыштафа Радзівіла ўглыб маскоўскіх зямель[47].

*Пры падрыхтоўцы войска Рэчы Паспалітай да аблогі Пскова ў жніўні 1581 года Стэфан Баторый загадаў гетману польнаму літоўскаму Крыштафу Радзівілу здзейсніць конны рэйд углыб маскоўскіх тэрыторый з мэтай адцягнуць на сябе частку сіл непрыяцеля. У адпаведнасці з першапачатковым планам, аддзелы літоўскай конніцы павінны былі ісці на Тарапец і Холм, аднак даведаўшыся аб тым, што Іван IV выслаў карную экспедыцыю супраць вялікалукскіх, усвяцкіх і веліжскіх мяшчан, Крыштаф Радзівіл вырашыў пераняць непрыяцеля. Зблізіўшыся з трохтысячным маскоўскім аддзелам, гетман выслаў супраць яго 700 вершнікаў пад камандаваннем Багдана Агінскага. У выніку пераможнай бітвы непрыяцельскае войска было звернута ва ўцёкі, многія маскоўцы былі забіты, некалькі чалавек трапіла ў палон[48].*

*У далейшым аддзелы літоўскай конніцы дайшлі да берагоў Волгі, дзе ў гэты час у Старыцы[49] знаходзіўся сам Іван IV. Крыштаф Радзівіл*

---

[46] *Калі ўзнікала неабходнасць тэрміновага склікання войска, вялікі князь прызначаў з ліку найбольш падрыхтаваных у вайсковай справе асоб ротмістраў і надаваў ім прыпаведныя лісты – загадныя дакументы на фарміраванне новых аддзелаў (харугваў), у якіх акрэсліваўся іх колькасны склад, ўзбраенне і абавязацельтсвы скарба па аплаце службы Пасля атрымання прыпаведнага ліста, ротмістр, з ліку асабіста знаёмых шляхціцаў, вербаваў таварышаў, кожны з якіх прыводзіў 2-3 пахолкаў (слуг). Такім чынам адбывалася фарміраванне харугвы, якая звычайна налічвала 100-150 коннікаў. Камандаваў харугвай ротмістр. У далейшым харугвы (ад 4 да 10) утваралі полк. Камандуючы палка (палкоўнік) адначасова быў ротмістрам асноўнай харугвы, што уваходзіла ў яго склад.*

[47] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 295.

[48] Rajnolda Hejdensztejna sekretarza królewskiego, Dzieje Polski od śmierci Zygmunta Augusta do roku 1594 : ksiąg XII. T. 2 – Petersburg : nakładem i drukiem B. M. Wolffa, 1857. S. 76.

[49] Сёння Старыца – горад у Цвярской вобласці Расіі, прыстань на Волзе.

*загадаў спустошыць наваколлі горада, так што маскоўскі цар з вокнаў сваёй рэзідэнцыі бачыў дым палаючых вёсак.*

*Адмовіўшыся ад штурму Старыцы, гетман накіраваў свае войскі ў бок возера Ільмень, па дарозе здабыўшы яшчэ некалькі перамог над непрыяцелем. 22 кастрычніка Крыштаф Радзівіл дасягнуў Пскова, злучыўшыся з асноўнымі польска-літоўскімі сіламі.*

Аблога Пскова скончылася беспаспяхова, аднак вымусіла Івана IV распачаць мірныя перамовы. Пасля заключэння Ям-Запольскага міра ў 1582 годзе Багдан Агінскі быў прызначаны адным з упаўнаважаных па перадачы Маскоўскай дзяржаве захопленых у яе гарадоў, у тым ліку, Вялікіх Лук.

Яшчэ падчас Лівонскай вайны ў 1580 годзе Багдан Агінскі быў прызначаны падкаморым троцкім[50]. Дзяржаўца[51] кармялоўскі ад 1579 года, койрышскі ад 1580 года, дарсунішскі ад 1586 года. У 1587 і 1615 гадах накіроўваўся паслом у Маскву для вядзення мірных перамоў[52].

У 1596 годзе ўдзельнічаў у разгроме казацкіх аддзелаў Налівайкі, пры гэтым замяшчаў вялікага гетмана літоўскага.

*Летам 1594 года на паўднёвых землях Рэчы Паспалітай успыхнула казацкае паўстанне пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі. Восенню 1595 года войска Налівайкі перайшло на тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага. Ужо 6 лістапада казакі занялі Слуцк, а 13 снежня захапілі Магілёў:*

> *"горад слаўны Магілёў, горад пабожны, дамы, крамы, астрог спалілі дашчэнту, дамоў усіх каля 500, а крамаў з вялікімі скарбамі 400. Мяшчан, баяр, людзей пабожных, як мужчын, так і жанчын, а таксама дзяцей малых пабілі, пасеклі, паганьбілі"*[53].

*Неўзабаве пасля захопу Магілёва войскі Налівайкі адышлі на Палессе. Вялікі гетман літоўскі Крыштаф Радзівіл абвясціў паспалітае рушэнне. У хуткім часе ў ваколіцах Копыля было сканцэнтравана трохтысячнае шляхецкае войска. Казацкія аддзелы Налівайкі пакінулі тэрыторыю Вялікага Княства Літоўска, кіруючыся на ўкраінскія землі.*

---

[50] Падкаморы – ураднік у Вялікім Княстве Літоўскім, які разглядаў зямельныя спрэчкі паміж шляхтай адпаведнага павета. Прызначаўся вялікім князем з чатырох кандыдатаў, якія абіраліся шляхтай на павятовых сойміках.

[51] Дзяржаўца – часовы ўладальнік і кіраўнік дзяржаўнага маёнтка.

[52] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 295.

[53] Баркулабовская летопись. Полное собрание русских летописей. Т. 32. – М. : Из-во "Наука", 1975. С. 182.

*Крыштаф Радзівіл выехаў для ўдзелу ў сойме у Слонім, перадаўшы камандаванне войскам Багдану Агінскаму.*

*Жыгімонт III загадаў літоўскаму войску працягваць пераслед казакаў і аказаць дапамогу вялікаму гетману каронnaму Станіславу Жалкеўскаму. Прайшоўшы маршам па левым беразе Дняпра, тысячны аддзел літоўскай конніцы пад камандаваннем Багдана Агінскага злучыўся з каронным войскам пад Лубнамі. У хуткім часе казацкія войскі былі канчаткова разбіты. 7 чэрвеня 1596 года Налівайка капітуляваў*[54].

Браў удзел у вайне Рэчы Паспалітай са Швецыяй у 1601-1602 гадах. Увесну-летам 1601 года разам з Янушам Радзівілам камандаваў кавалерыйскім палком. Вызначыўся ў бітве пад Кокенгаузенам 23 чэрвеня 1601 года – адной з найбольш значных перамог літоўскай гусарыі. Затым застаўся ў Лівоніі, дзе ў Рызе кантраляваў працы па падрыхтоўцы да восеньскай кампаніі галоўнага войска Рэчы Паспалітай пад камандаваннем вялікага гетмана кароннага Яна Замойскага. У пачатку лістапада 1601 года даставіў да абложанага Замойскім Вольмара артылерыю, што значна прыспешыла захоп горада. Зімой 1602 года працягваў знаходзіцца ў Рызе, дзе ажыццяўляў нагляд за падрыхтоўкай артылерыі для патрэб далейшай кампаніі Замойскага[55].

Падчас рокашу 1606-1607 гадоў (бунту шляхты супраць Жыгімонта III Вазы) застаўся на баку караля.

Абіраўся паслом на соймы Рэчы Паспалітай 1607, 1609, 1611, 1613 і 1615 гадоў, дзе прызначаўся ў розныя камісіі: пабудовы замкаў на ўсходняй мяжы Рэчы Паспалітай, урэгулявання спраў татараў і інш.

У 1607 годзе спецыяльнай соймавай пастановай быў зацверджаны прывілей на атрыманне Багданам Агінскім 8 000 злотых “за значныя паслугі ў рыцарскіх справах”[56].

Абіраўся маршалкам Галоўнага Трыбуналу Вялікага Княства Літоўскага[57].

---

[54] *Piotr Łabędź* Działania hetmana Krzysztofa Radziwiłła „Pioruna” wymierzone przeciw powstaniu kozackiemu Semena Nalewajki na ziemiach Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1595–1596 // Klio. Czasopismo poświęcone dziejom Polski i powszechnym. T. 33 (2) / 2015, S. 68-70.

[55] *Wasilewski T.* Ogiński Bogdan Marcjan // Polski słownik biograficzny. T. XXIII/3. – Kraków, 1978. – S. 600.

[56] Constitucie Seymu Walnego Koronnego w Warszawie Roku P[anskieg]o MDCVII. – Kraków, 1607. – S. 45.

[57] *Wasilewski T.* Ogiński Bogdan Marcjan … S. 600.

*Галоўны Трыбунал – вышэйшы апеляцыйны суд Вялікага Княства Літоўскага, пастановы якога мелі сілу пастановаў сойма. Складаўся з 46 суддзяў-дэпутатаў, якія абіраліся са шляхты на сойміках (па 2 чалавекі ад кожнага павета) тэрмінам на адзін год. Пасяджэннямі Галоўнага Трыбунала кіраваў выбраны суддзямі маршалак.*

З прычыны старасці не браў удзелу ў Хоцінскай вайне супраць Асманскай імперыі ў 1621 годзе. Накіраваў на яе сыноў Аляксандра, Самуэля і ўнука (сына дачкі Ганны) Яна Стэткевіча[58].

Быў адным з галоўных абаронцаў праваслаўя ў Вялікім Княстве Літоўскім. З’яўляўся сябрам і, у перыяд найбольш вострага супрацьстаяння з уніяцкім мітрапалітам Іпаціем Пацеем, старастай Віленскага праваслаўнага брацтва.

Неаднаразова выступаў у абарону Праваслаўнай Царквы на соймах і ў Трыбунале Вялікага Княства Літоўскага. Апекаваўся віленскімі манахамі з манастыра Святой Тройцы, калі той быў заняты ўніятамі. Пасля закрыцця брацкай друкарні ў Вільні аднавіў яе дзейнасць ва ўласным маёнтку Еўі ў 1611 годзе, фінансаваў выданне літургічных кніг.


ГРАММАТІКИ
Славенскиѧ правилное
Сѵнтаґма,

*Першым выданнем друкарні ў Еўі стаў Новы Запавет з Псалтыром (1611). Пазней у ёй былі выдадзены Часаслоў і Дзіоптра (1612), Анфалагіён (1613), Евангелле навучальнае (1616) – адзін з буйнейшых і найбольш прыгожых помнікаў кнігадрукавання ў Вялікім Княстве Літоўскім XVII ст.*

*Аднак найбольш значнай кнігай, выдадзенай у Еўі, стала “Граматыка” Мялеція Смятрыцкага (1618-1619). Выданне было дасканала падрыхтаваным. На адваротным баку тытульнага ліста размяшчаўся герб Багдана Агінскага з літарама B.O.P.T. – Багдан Агінскі Падкаморы Троцкі (гл. мал. на вокладцы). У далейшым кніга неаднаразова перавыдавалася і на працягу двух стагоддзяў не губляла свайго значэння ў якасці падручніка царкоўнаславянскай мовы. Расійскі вучоны*

---

[58] Trenograf, albo żałosne opisanie żywota, testamentu i śmierci Bohdana Ogińskiego podkomorzego trockiego (Jewie 1625), [w:] Polskojęzyczna poezja ukraińska od końca XVI do początku XVIII wieku, cz. II. Antologia, oprac. R. Radyszewskyj. – Kraków, 1998. – S. 101-102.

*Міхаіл Ламаносаў называў яе “брамай сваёй вучонасці”.*

У 1617 годзе набыў для праваслаўнага брацтва два дамы ў Вільні каля царквы Святога Духа, фінансава падтрымліваў заснаваную пры ім школу[59]

Ажыццяўляў актыўную дзейнасць па будаўніцтве цэркваў і манастыроў: быў заснавальнікам мураванай царквы Святой Тройцы ў Кронях[60], царквы і манастыра Ўспення Найсвяцейшай Багародзіцы ў Еўі[61]. У 1612 годзе разам з сынамі Янам і Аляксандрам падпісаў фундуш на заснаванне царквы Святых Пятра і Паўла ў Мінску.




*Сабор Святых апосталаў Пятра і Паўла ў Мінску, адным з заснавальнікаў якога быў Багдан Мацвеевіч Агінскі*

Валодаў маёнткамі Агінты, Кроні, Еўе ў Троцкім павеце, а таксама Мікулін у Віцебскім павеце.

[59] *Wasilewski T.* Ogiński Bogdan . . . S. 600.
[60] Сёння Круоніс (Kruonis) – мястэчка Кайшадорскага раёна ў Каўнаўскім павеце Літвы.
[61] Сёння Веві́с (Vievis) – горад у складзе Эляктрэнайскага самакіравання ва ўсходняй Літве.

Першы ўладальнік Мікуліна з роду Агінскіх. У 1595 годзе атрымаў прывілей на маставое (права збору мыта за праезд праз мост) у Мікуліне, у 1598 годзе – прывілей на прыкаморак (пункт збору мыта) у мястэчку, “якое ляжыць на дарозе з Віцебска ў Смаленск, калі здраднікі і шпіёны маскоўскія ездзяць, каб пільнаваў іх і іншымі дарогамі ездзіць не дазваляў”[62].

Прынамсі ад 1582 года быў жанаты на Раіне (Рэгіне) Грыгор’еўне Валовіч – дачцэ Грыгорыя Багданавіча Валовіча, ваяводы смаленскага, і яго першай жонкі, імя якой невядома. Меў з ёй 12 дзяцей, з якіх паўналецця дасягнулі Дзмітрый (памёр у 1610 годзе), Ян, Аляксандр, Самуэль, Ганна, Барбара, Дарота і Апалонія[63].

Памер у 1625 годзе[64]. Пахаваны ў заснаванай ім мураванай царкве Святой Тройцы ў Кронях.

Захавалася надмагільная пліта Багдана Мацвеевіча Агінскага – прамавугольнік з цёмна-фіялетавага мармуру даўжынёй 214 см і вышынёй 131 см. У верхняй частцы надмагілля размешчана фігура рыцара, які спачывае на высокім саркафагу простай формы, паверхня якога ўпрыгожана памятным надпісам. На саркафагу ўздоўж левай рукі рыцара ляжыць булава – сімвал вайсковай улады. У левым верхнім куце пліты размешчана выява герба Багдана Мацвеевіча Агінскага. Надпіс на паверхні саркафага складаецца з двух частак. Першая на латыні выгравіравана вялікімі літарамі:

OBYT IN CHRYSTO MAGNIFICO DOMINO THEODORO OGINSKI DE COZIELSK SUBCAMERARIO TROCENSIS CAPITANEO DORSUNIENSIS ET CORMIALOVIENSIS ANNO 1625 DIE 7 FBII AETATIS SUAE 74
EPITAPHIUM

АДЫШОЎШАМУ Ў ХРЫСЦЕ ВЯЛЬМОЖНАМУ ПАНУ ТЭАДОРУ АГІНСКАМУ З КАЗЕЛЬСКА ПАДКАМОРАМУ ТРОЦКАМУ ДЗЯРЖАЎЦЫ ДАРСУНІШСКАМУ І КАРМЯЛОЎСКАМУ ГОДА 1625 ДНЯ 7 ЛЮТАГА ВА ЎЗРОСЦЕ 74 ГАДОЎ ЭПІТАФІЯ

---

[62] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 294.
[63] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 295.
[64] Kazanie na znakomity pogrzeb W. J. Pana Bohdana Martimiana Ogińskiego z Kozielska podkomorzego trockiego, etc. odprawowane przez Oyca Jozepha Bobrykowicza Zakonnika Monastera Bractskiego Wileńskiego Cerkwi Św. Ducha w Cerkwi krońskiej ruskim języku, a po tym za żądaniem wielu na polski przełożone. A. 1625, maij 15 die. – Jewie, 1625.

Другая частка надпісу выканана на польскай мове і ўяўляе сабой панегірык памерламу:

*Ktos kolwiek jest co wiedziec pragniesz o tym panie*
*Oginskim de Cozielsko prczcacnym Bohdanie*
*Mąž to był wszelkich cnot pan mądry w pokoju*
*Biegły w dziełach rycerskich mężny w krawawym boju*
*Ten bił niemce rebelles ten bił zamorczyki*
*Ten z armatą w Inflanciech tlumil gęste sziki*
*Ten moskala hardego po zapiekłych rolach*
*Krwią skropiwszy podeptał ten i w dzikich polach*
*Naliwaika Łobode wział w lyki swawolnych*
*Ten od gwałtu morderstwa wielu czynil wolnych*
*Tego ciało w tym grobie dusza w niebie sława*
*Niesmertelna na wieki w pamienci zostawa*

*Хто ты ня ёсць, што ведаць прагнеш аб тым пане*
*Агінскім з Казельска высокашаноўным Багдане*
*Муж гэта быў усіх цнотаў пан мудры ў спакоі*
*Дасведчаны ў рыцарскіх справах мужны ў крывавым боі*
*Ён біў нямецкіх паўстанцаў ён біў замарчанаў*
*Ён з гарматай у Інфлянтах стрымліваў шчыльныя шэрагі*
*Ён напышлівага маскаля па запеклай раллі*
*Акрапіўшы крывёй патаптаў ён і ў дзікіх палях*
*Налівайку Лабаду свавольных пазбавіў свабоды*
*Ён ад гвалту забойства вызваляў многіх*
*Яго цела ў гэтай магіле душа ў небе*
*Несмяротная слава на векі ў памяці застаецца*

Раіна (Рэгіна) Грыгор'еўна Валовіч упершыню выступае ў дакументах побач з мужам у 1582 годзе.

У пераемнікаў Астафія Валовіча набыла Мікулін у Віцебскім павеце і ўнесла яго мужу Багдану Мацвеевічу Агінскаму, які, ў сваю чаргу, запісаў маёнтак ёй у пажыццёвае валоданне. У 1633 годзе перадала права на пажыццёвае валоданне Мікуліным тром сынам: Яну, Аляксандру і Самуэлю.

У 1629 годзе заснавала пры царкве ў Кронях манастыр.

Апошняя згадка пра Раіну (Рэгіну) з Валовічаў Агінскую адносіцца да 1637 года. Неўзабаве пасля гэтага памерла. Пахаваная ў мураванай царкве Святой Тройцы ў Кронях побач з мужам[65].

[65] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 295-296.



*Царква Св. Тройцы ў м. Кроні, узведзеная ў 1610 г. Б.М. Агінскім*



*Надмагільная пліта Б.М. Агінскага ў царкве Св. Тройцы ў м. Кроні*

# Самуэль Багданавіч Агінскі

Каля 1625 года Лёзна было вылучана з маёнтка Мікулін у асобнае ўладанне, гаспадаром якога стаў малодшы сын Багдана Мацвеевіча Агінскага – Самуэль.

*Кніга Віцебскага гродскага суда ўтрымлівае запіс ад 28 ліпеня 1627 г. аб уцёках сялян з маёнтка Лёзна ў Віцебскім ваяводстве да смаленскіх валасцей Рускай дзяржавы. Ураднік маёнтка Лёзненскага Ян Вайцяховіч апавядаў, што падданыя яго міласці князя Самуэля Агінскага з сяла Ляхавіка Іван Насыка і з сяла Якубаўшчызна Роцка Міхалкаў з жонкамі, дзецьмі і маёмасцю сваёй: коньмі, жывёлай усялякай, уночы з 15 на 16 і з 16 на 17 ліпеня 1627 г. за мяжу да смаленскіх валасцей прэч паўцякалі*[66].

Самуэль Багданавіч Агінскі – дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, ротмістр, стольнік і цівун троцкі.

Нарадзіўся каля 1595 года. Малодшы сын Багдана Мацвеевіча Агінскага, падкаморага троцкага, і Раіны (Рэгіны) Валовіч.

Упершыню згадваецца ў 1619 годзе ў сувязі са шлюбам з Сафіяй Білевіч. Казанне да маладых прамовіў архімандрыт Віленскага брацкага праваслаўнага манастыра Святога Духа Леонцій Карповіч[67].

У 1620 годзе прызначаны стольнікам троцкім.

*Стольнік – першапачаткова ўраднік велікакняжацкага двара, які загадваў сервіроўкай стала і абслугоўваннем урачыстых трапез, пазней – ганаровая пасада, не звязаная з выкананнем канкрэтных абавязкаў. Ад XVII стагоддзя намінальныя ўрады стольнікаў былі ўведзены таксама ў паветах.*

У 1621 годзе ў чыне ротмістра прымаў удзел у Хоцінскай вайне супраць Асманскай імперыі. Камандаваў гусарскай харугвай (150 коней), якая ўваходзіла ў склад палка вялікага гетмана літоўскага Яна Караля Хадкевіча[68].

---

[66] Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии : конец XIV в. – 1648 г. Том первый. – Минск : Наука и техника, 1988. № 130.

[67] Przemowa y napomnienie do oblubieńcow w Stan S. małżeński wstępuiących : Przy Szlvbie [...] Kniazia Samuela Ogińskiego, Podkomorzyca Trockiego [...] Y [...] Zophiey Bilewiczowny, [...] – Wilna, 1619.

[68] Жерела до історії України-Руси. Том 8. Матеріали до історії української козаччини. Том I. Документи по рік 1631. - Львів, 1908. – С. 246.

У 1633 годзе прызначаны цівуном троцкім.

*Цівун – ураднік у Вялікім Княстве Літоўскім, першапачаткова – кіраўнік ці дзяржаўца велікакняжацкага маёнтка, пазней – ганаровая пасада, адзінай кампетэнцыяй цівуна было ўрачыстае адкрыццё павятовых соймікаў.*

У 1635 годзе названы каралеўскім дваранінам.

Абіраўся паслом на соймы Рэчы Паспалітай 1628, 1643, 1647, 1648 і 1649 гадах[69].

Ад пачатку 1640-х гадоў выкарыстоўваў таксама падвойнае імя Леў Самуэль ці Самуэль Леў.

Быў першым “віцебскім” Агінскім. Наяўнасць зямельнага ўладання ў Віцебскім павеце і ваяводстве – маёнтка Лёзна – дазваляла Самуэлю Агінскаму ўдзельнічаць у сходах мясцовай шляхты. Менавіта на павятовых і ваяводскіх сойміках вырашаліся асноўныя справы, выбіраліся кандыдаты на пасады мясцовых ураднікаў, дэпутаты ў склад Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага, паслы на сойм Рэчы Паспалітай. У якасці прадстаўніка Віцебскага павета і ваяводства Самуэль Агінскі браў удзел у агульнадзяржаўных соймах і падпісваў элекцыі (акты выбару) Уладзіслава IV (1632)[70] і Яна II Казіміра (1648)[71].

Да 1627 года адносяцца першыя звесткі пра зямельны ўчастак (пляц) і дом Агінскіх на Ніжнім замку ў Віцебску[72]. На працягу наступных гадоў Самуэль Агінскі актыўна набываў зямельныя ўладанні ў горадзе. Паводле інвентара Віцебска 1641 года яму належалі пяць дамоў з агародамі ў Рускім пасадзе на правым беразе Заходняй Дзвіны[73]. На ўчастку зямлі на тэрыторыі Ніжняга замка неўзабаве быў узведзены драўляны палац асіметрычнай кампазіцыі, выява якога захавалася на чарцяжы места Віцебска 1664 года.

---

[69] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 302.

[70] Elektorowie królów Władysława IV., Michała Korybuta, Stanisława Leszczyńskiego i spis stronników Aughusta III. / zestawili w porządek abecadłowy Jerzy Dunin-Borkowski i Miecz. Dunin-Wąsowicz – Lwów, 1910. S. 152.

[71] Elektorów poczet, którzy niegdyś głosowali na elektorów Jana Kazimierza roku 1648, Jana III. roku 1674, Augusta II. roku 1697, i Stanisława Augusta roku 1764, najjaśniejszych Królów Polskich, Wielkich Książąt Litewskich, i.t.d. / ułożył i wydał Oswald Zaprzaniec z Siemuszowej Pietruski. – Lwów : Bochnia, 1845. S. 249.

[72] Историко-юридические материалы, извлечённые из актовых книг губерний Витебской и Могилёвской. Вып. 22. – Витебск, 1891. – С. 461.

[73] *Сапунов, А. П.* Витебская старина / А. П. Сапунов. — Витебск, 1891. — Т. 1. С. 368.




*Чарцёж места Віцебска 1664 год*



*Палац Агінскіх. 1664 год. Малюнак Паўла Татарнікава*

Працягваў палітыку бацькі па абароне праваслаўя ў Вялікім Княстве Літоўскім. З'яўляўся сябрам Віленскага праваслаўнага брацтва[74]. Заснаваў царкву і манастыр Святой Тройцы ў маёнтку Маркаве пад Віцебскам.

*Гэта падзея мела асаблівае значэнне для праваслаўных жыхароў горада. Пасля забойства ў 1623 годзе ўніяцкага мітрапаліта Іасафата Кунцэвіча ў Віцебску былі зачынены ўсе праваслаўныя цэрквы. Мяшчане збіраліся на богаслужэнні ў часовых навесах за межамі горада. У 1633 годзе каля аднаго з такіх навесаў на правым беразе Дзвіны Самуэлем Агінскім была ўзведзена драўляная царква Святой Тройцы. У 1638 годзе каля Троіцкай царквы пачалася пабудова Маркава мужчынскага манастыра, фармальнае заснаванне якога адбылося ў 1642 годзе*[75].

У пачатку 1640 года Самуэлем Агінскім была здзейснена спроба заснавання праваслаўнай царквы ў самім Віцебску – ва ўласным двары на Німнім замку. Аднак ужо ў красавіку 1640 года наваўтвораная святыня была знесена ўраднікамі віцебскага ваяводы Казіміра Кішкі па загадзе караля і вялікага князя Уладзіслава IV[76].

Ад 1619 года быў жанаты на Сафіі Білевіч, дачцэ Яна Білевіча, цівуна шадоўскага, і Рэгіны Лукомскай. Меў з ёй двух сыноў: Караля і Яна і чатыры дачкі: Крысціну, Алену, Кацярыну і Рэгіну.

Сафія Білевіч разам з мужам падпісала ў 1642 годзе фундуш на заснаванне Маркава манастыра. Неўзабаве пасля гэтага памерла. Пахавана ў царкве Святой Тройцы ў Кронях. 8 студзеня 1646 года Самуэль Агінскі запісаў манастыру ў Кронях 500 злотых на малітвы за душу памерлай жонкі[77].

Валодаў маёнткамі Лёзна і Мікулін у Віцебскім павеце, Агінты і Кроні ў Троцкім павеце.

---

[74] *Голубев, С.* Киевский митрополит Петр Могила и его сподвижники: (опыт историческаго изследования)/ [соч.] С. Голубева. Т. 2. – Киев : тип. Г. Т. Корчак-Новицкаго, 1898. С. 496.

[75] Акты, издаваемые Комиссиею, высочайше учрежденною для разбора древних актов в Вильне : Т. 11. – Вильна : тип. А.Г. Сыркина, 1880. С. 128-132.

[76] *Kempa, Tomasz* Prawosławie i unia we wschodnich województwach WKL w końcu XVII w. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Z. 22 (2004), S. 38.

[77] Собрание древних грамот и актов городов: Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам. - Ч. 2. - Вильно - тип. А. Марциновского, 1843. С. 130.

З пачаткам вайны Расіі з Рэччу Паспалітай у 1654 годзе пакінуў Віцебск і накіраваўся ў заходнія землі Вялікага Княства Літоўскага.

*У лістападзе 1655 года Самуэль Агінскі знаходзіўся ў стане ўзброенай шляхты Лідскага, Гродзенскага і Ваўкавыскага паветаў пад Мсцібавам*[78]*, адкуль разам з сынам Каралем Агінскім, падкаморым віцебскім, і Янам Нарбутам, пісарам земскім лідскім, быў накіраваны ў складзе пасольства да царскага віленскага ваяводы Міхайлы Шахоўскага. Ужо 22 лістапада паслы прысягнулі на вернасць рускаму цару*[79]*. Пасля гэтага Самуэль Агінскі вярнуўся да Мсцібава, дзе праводзіў агітацыю сярод шляхты, схіляючы яе да пераходу пад уладу Масквы. У выніку яго захадаў ужо 6 снежня 1655 года шляхта Лідскага, Гродзенскага і Ваўкавыскага паветаў (усяго каля 1000 чалавек) прысягнула на вернасць Аляксею Міхайлавічу*[80].

20 кастрычніка 1654 г. у Троках склаў тэстамент (духоўнае завяшчанне)[81]. Пражыў пасля гэтага яшчэ тры гады. Памёр восенню 1657 года. Пахаваны ў царкве Святой Тройцы ў Кронях, “у капліцы маёй, дзе бацькі мае ляжаць”. Там жа павінен быў быць усталяваны “камень мой, гатовы, зроблены маім коштам у Круляўцы[82] з надпісам”[83].

Захаваўся надмагільны камень Самуэля Агінскага. Прамавугольнік правільнай формы з фіялетавага мармуру даўжынёй 190 см і вышынёй 111 см. У ніжняй частцы надмагілля размешчана рэльефная фігура рыцара, які напаўляжыць з заплюшчанымі вачыма. Над фігурай рыцара знаходзіцца дошка для надпісу. З аднаго боку ад яе выяўлены геральдычны шчыт, з іншага – шлем. Вакол герба выграviраваны літары S L O (Samuel Lew Oginski), C T (ciwum trocki), DK IM (dworzanin krola iego milosci). Усю кампазіцыю атачае шырокая паласа арнаменту. Надпіс на дошцы так і не быў здзейснены.

---

[78] Сёння Мсцібава – вёска ў Ваўкавыскім раёне Гродзенскай вобласці.

[79] Акты Московского государства: Том II. Разрядный приказ. Московский стол. 1635 - 1659 гг. – СПб. : Тип. Императорской академии наук, 1894. С. 459.

[80] *Płosiński, Jacek* Wyprawa kniazia Semena Urusowa na Brześć (listopad-grudzień 1655 r.) // Mazowieckie Studia Humanistyczne. Tom 9, 2003. S. 17, 22.
Z dziejów stosunków Rzeczypospolitej Obojga Narodów ze Szwecją w XVII wieku, red. Mirosław Nagielski (Fasciculi Historici Novi, t. 8). – Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2007. S. 287-288.

[81] Акты, издаваемые Комиссиею, высочайше учрежденною для разбора древних актов в Вильне : Т. 12. – Вильна : тип. А.Г. Сыркина, 1883. С. 562-570.

[82] Сёння Калінінград – горад у Расіі, самы заходні абласны цэнтр Расійскай Федэрацыі.

[83] *Ibidem,* S. 563.



*Надмагільная пліта С.Б. Агінскага ў царкве Св. Тройцы ў м. Кроні*

Менавіта тэстамент Самуіла Агінскага ўтрымлівае найбольш важныя звесткі з гісторыі Лёзна другой чвэрці XVII стагоддзя:

*"Найперш тады маёнтак мой рускі Лёзна . . . размешчаны ў Віцебскім ваяводстве, двор Лёзнеўскі, мной самім на пустым месцы збудаваны, і мястэчка Лёзна ўзведзенае, з пабудовамі, маёй уласнай працай і заселенае падданымі, з быдлам рагатым і нерагатым, з дворнымі пабудовамі і раллёй, землямі ворнымі і няворнымі, з усімі падданымі, здаўна ў тым уладанні аседлымі, з азерамі, з рэкамі, з млынамі, лясамі, пушчамі, борцямі і ўсімі выгодамі . . . на вечныя часы даю, дарую і запісваю сыну майму пану Шыману Каралю Агінскаму – падкамораму віцебскаму"*[84].

Такім чанам, Самуэля Агінскага можна лічыць сапраўдным "бацькам-заснавальнікам" Лёзна. Атрымаўшы ў спадчыну невялікае ўладанне, якое дагэтуль было часткай маёнтка Мікулін, ён прыняў належныя меры па яго развіцці: збудаваў панскі двор і ўзвёў мястэчка. Менавіта дзень складання тэстамента – 20 кастрычніка 1654 г. – лічыцца датай першай згадкі Лёзна як мястэчка ў пісьмовых крыніцах.

[84] *Ibidem,* S. 564-565.

# Шыман Караль Агінскі

Шыман Караль Агінскі – дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, падкаморы віцебскі, мечнік вялікі літоўскі, ваявода мсціслаўскі.

Нарадзіўся каля 1621 года. Старэйшы сын Самуэля Багданавіча Агінскага, цівуна троцкага, і Сафіі Білевіч.

Упершыню згадваецца ў 1633 годзе ў тэстаменце (духоўным завяшчанні) сваёй бабкі Раіны (Рэгіны) Валовіч[85].

22 чэрвеня 1641 г. быў залічаны для навучання аратарскаму майстэрству ва ўніверсітэт горада Франэкер (Franeker) у Фрысландыі (Нідэрланды).

*У гэты час адносіны паміж мясцовымі (фрызскімі) і замежнымі студэнтамі складваліся не найлепшым чынам. 16 лютага 1643 г. дайшло да рэальнага канфлікту – падчас жорсткай вулічнай бойкі адзін з маладых людзей, студэнт тэалогіі Ёган Прак, быў забіты. Караль Агінскі быў затрыманы і абвінавачаны ў нанясенні Праку смяротнай раны (часткова – на падставе сведчанняў свайго суайчынніка Матэуша Гофмана)[86].*



*Франэкерскі ўніверсітэт, 1622 год*

*Падчас судовых слуханняў ён даводзіў, што студэнты з Рэчы Паспалітай самі падверглiся нападу, і, ужо адступаючы, аказвалі супраціўленне. Што тычыцца пазіцыі Гофмана – то менавіта ён і з'яўляецца забойцам. Пры гэтым след крыві на кінжале апошняга ідэальна адпавядаў нанесенай Праку ране. 25 красавіка 1643 г. Караль Агінскі быў апраўданы у сувязі з недахопам доказаў[87].*

[85] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 296.
[86] *Broos B. P. J.* Rembrandt's Portrait of a Pole and His Horse // Simiolus: Netherlands Quarterly for the History of Art. Vol. 7, No. 4 (1974), P. 215-216.


HONESTVS
HOMO
Sive
ARS PLACENDI
IN AULA
*Ex Gallico opere Fareti versa in Latinum.*
à
CAROLO OGINSKI.
FRANEKERÆ,
Typis Idsardi Alberti, ejusdemque & Joannis Arcerii impensis, Anno 1643.
11.407

Інцыдэнт, тым не менш, атрымаў шырокі розгалас пасля таго, як прафесар Ёган Какцэй (Coccejus) паклаў яго ў аснову сваёй прамовы Oratio Νουθετικη[88].

У сувязі з выданнем прамовы, Караль Агінскі прадпрыняў экстраардынарную спробу захаваць уласны гонар і рэпутацыю. Ён пераклаў з французскай на лацінскую мову кнігу Бальтазара Касьцільёнэ (Castiglione) пра паводзіны пры двары, і ў тым жа 1643 годзе выдаў яе ва ўніверсітэцкай друкарні Франэкера пад назвай Honestus Homo Sive Ars Placendi in aula[89].

Тэксту кнігі папярэднічае прысвячэнне бацьку Самуэлю Агінскаму, а таксама ода прафесара красамоўства П’ера Вінсеміўса (Winsemius) да самаго Караля Агінскага.

Пра поспех спробы абараніць сваю рэпутацыю сведчыць той факт, што ўжо ў хуткім часе (у 1644 ці 1645 годзе) Караль Агінскі ажаніўся з прадстаўніцай мясцовай арыстакратыі Тацыяй Стаакман, дачкой памерлага бургамістра Франэкера Вільгельма Стаакмана. Напачатку маладыя пераехалі ў Вялікае Княства Літоўскае, аднак ужо ў 1648 годзе вярнуліся ў Нідэрланды і пасяліліся ў Гронінгене (Groningen). Тут яны пражывалі прынамсі да 1653 года.[90].

Пасля 1653 года Караль Агінскі вярнуўся на радзіму, дзе ў 1654 годзе атрымаў пасаду падкаморага віцебскага. У гэты час Тацыя Стаакман пакінула мужа. У далейшым пражывала ў Нідэрландах.

Калі ў 1654 годзе пачалася вайна Расіі з Рэччу Паспалітай, Караль Агінскі разам з бацькам пакінуў Віцебск і накіраваўся ў заходнія землі Вялікага Княства Літоўскага. У лістападзе 1655 года знаходзіўся ў стане ўзброенай шляхты Лідскага, Гродзенскага і Ваўкавыскага паветаў пад Мсцібавам, адкуль у складзе пасольства быў накіраваны да царскага

---

[87] *Boeles, W. B. S.* Frieslands Hoogeschool En Het Rijks Athenaeum Te Franeker, Volume 1 – Leeuwarden : Provincial Genootschap te beofening der Friesche Geschied-, Oudheid- en Taalkunde , 1878. S. 295.
[88] *Cocceii Johannis* Oratio Νουθετικη Ad Studiosos, Quum in Tumulto Vespertino ... Johannes Prack ... Occubuisset, Etc – Franekeræ, 1643 – 44 s.
[89] Honestus Homo Sive Ars Placendi In Aula Ex Gallico opere Fareti versa in Latinum a Carolo Oginski. - Franekeræ, 1643 – 188 s.
[90] *Broos B. P. J.* Rembrandt's Portrait … S. 216.

віленскага ваяводы Міхайлы Шахоўскага. 22 лістапада прысягнуў на вернасць Аляксею Міхайлавічу. У пачатку 1656 года здзейсніў візіт да рускага цара [91]. Неўзабаве вярнуўся ў падданства Рэчы Паспалітай. Ужо ў 1660 годзе далучыўся да дывізіі гетмана польнага літоўскага Вінцэнта Гансеўскага. Да 1663 года ў чыне паручніка браў актыўны ўдзел у баявых дзеяннях супраць рускіх войск.

Пасля заключэння Андрусаўскага замірэння ў 1667 годзе, калі Віцебск быў вернуты ў склад Рэчы Паспалітай, працягваў займаць пасаду падкаморага віцебскага.

У якасці прадстаўніка Віцебскага ваяводства падпісваў элекцыі (акты выбару) Міхала Вішнявецкага (1669)[92] і Яна Сабескага (1674)[93].

У 1679 годзе быў прызначаны мечнікам вялікім літоўскім[94], у 1685 годзе – ваяводам мсціслаўскім. Займаў гэту пасаду да 1688 года, пасля чаго зноў вярнуўся да тытула мечніка вялікага літоўскага.

Да 1654 года карыстаўся толькі іменем Караль. У тэстаменце (духоўным завяшчанні) бацькі Самуэля Агінскага ўпершыню названы Шыманам Каралем[95]. Ад таго часу выступае пад падвойным іменем.

Актыўна падтрымліваў праваслаўе ў Вялікім Княстве Літоўскім. З’яўляўся сябрам, а ў 1672 годзе – старастай Віленскага праваслаўнага брацтва.

У 1680 годзе перайшоў у каталіцтва. Быў фундатарам касцёла і кляштара (манастыра) кармелітаў босых за ракой Віліяй у Вільні.

Нягледзячы на пераход у каталіцтва, працягваў падтрымліваць Праваслаўную Царкву. Так, у 1687 годзе Шыман Караль Агінскі надаў Маркаву манастыру дараваную грамату, якой пацвердзіў усе ўмовы

---

[91] Акты Московского государства: Том II. Разрядный приказ. Московский стол. 1635 - 1659 гг. – СПб. : Тип. Императорской академии наук, 1894. С. 459.

[92] Elektorowie królów Władysława IV., Michała Korybuta, Stanisława Leszczyńskiego i spis stronników Aughusta III … S. 152.

[93] Elektorów poczet, którzy niegdyś głosowali na elektorów Jana Kazimierza roku 1648, Jana III. roku 1674, Augusta II. roku 1697, i Stanisława Augusta roku 1764 … S. 249.

[94] Мечнік вялікі літоўскі – ураднік ў Вялікім Княстве Літоўскім, у абавязкі якога ўваходзіла падчас ўрачыстасцяў насіць наперадзе вялікага князя аголены меч, як сімвал вайсковай улады.

[95] Акты, издаваемые Комиссиею, высочайше учрежденною для разбора древних актов в Вильне : Т. 12. … С. 562-570.

фундушовага запісу, зробленага бацькамі Самуэлем Агінскім і Сафіяй Білевіч пры яго заснаванні[96].

*Дараваная грамата Шымана Караля Агінскага Маркаву манастыру, датаваная 27 студзеня 1687 г., з'яўляецца адным з найбольш ранніх дакументаў, напісаных у Лёзне.*

Пасля таго, як у 1690 годзе манастыр моцна пацярпеў пры пажары, за ўласныя грошы пабудаваў новыя драўляныя келлі і саборную царкву Святой Тройцы[97].

*Царква Святой Тройцы Маркава мужчынскага манастыра ўяўляла сабой цудоўны ўзор беларускай драўлянай архітэктуры. Першапачаткова была закладзена ў 1633 годзе Самуэлем Багданавічам Агінскім пры заснаванні манастыра. У 1690 годзе згарэла ў пажары. У тым жа 1690 годзе была адбудавана на старым каменным падмурку Шыманам Каралем Агінскім. Мела крыжовы план, была апаясана адкрытай галерэяй з разнымі драўлянымі калонамі. Знішчана ў канцы 1920-х гадоў.*



*Царква Св. Тройцы Маркава манастыра, мал. Дз. Струкава, паміж 1864 і 1867гадамі*

[96] *Сапунов, А. П.* Витебская старина … Т.1. С. 251-255.
[97] Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год / под ред. А. М. Сементовского. – СПб.: Тип. К. Вульфа, 1865. С. 15.

Валодаў маёнткамі Лёзна ў Віцебскім ваяводстве і Кроні ў Троцкім ваяводстве. У 1677 годзе набыў у брата Яна маёнтак Мікулін у Віцебскім ваяводстве[98]. У 1688 годзе разам з сынамі Багуславам, Марцыянам і Аляксандрам набыў у пляменніка, канцлера вялікага літоўскага, Марцыяна Аляксандра Агінскага маёнтак Стравенікі з мястэчкам Еўе ў Троцкім ваяводстве і маёнтак Рудня ў Віцебскім ваяводстве[99]. Валодаў таксама пэўнымі сумамі на маёнтку Агінты ў Троцкім ваяводстве, які належаў яго брату Яну.



*Царква Св. Тройцы Маркава манастыра на фотаздымку пач. XX ст.*

Быў тройчы жанаты. Першы раз ажаніўся падчас побыту ў Нідэрландах у 1644 ці 1645 годзе на Тацыі Стаакман, дачцэ памерлага бургамістра Франэкера Вільгельма Стаакмана. Меў з ёй трох дзяцей: Ёгана Вільгельма, Самуэля і Сафію, з якіх толькі апошняя дасягнула дарослага ўзросту[100]. У хуткім часе пасля вяртання ў Вялікае Княства Літоўскае Тацыя Стаакман пакінула мужа.

За другую жонку меў Тэадору Корсак, дачку Казіміра Ўладзіслава Корсака, маршалка мазырскага, і Крысціны Пацей. У гэтым шлюбе нарадзіліся трое сыноў: Багуслаў, Марцыян і Юрый (памёр да 1680 года) і дзве дачкі: Крысціна і Элеанора.

Трэцяй жонкай Шымана Караля была Тэрэза Война-Ясенецкая, дачка Аляксандра Война-Ясенецкага, кашталяна навагародскага, і Элеаноры Марыянны Горскай. Меў з ёй сына Аляксандра.

---

98 *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 316.
99 *Ibidem,* S. 301.
100 *Broos B. P. J.* Rembrandt's Portrait … S. 216.

Памер у пачатку 1699 года. Пахаваны ў заснаваным ім касцёле кармелітаў босых пад тытулам Святой Тэрэзы ў Вільні[101].



*Касцёл Св. Тэрэзы ў Вільні на малюнку 1830 г.*[102]

[101] Herbarz polski Kaspra Niesieckiego powiększony dodatkami z późniejszych autorów, rękopismów, dowodów urzędowych i wydany przez J. N. Bobrowicza. T. VII. Lipsk, 1841. S. 53.

[102] Будынак касцёла Св. Тэрэзы, падмыты ракой Віліяй, рухнуў у 1837 годзе, канчаткова знесены ў 1844 годзе. Сёння на яго месцы размяшчаецца Віленскі палац спорту.

Паводле аднаго з найбольш верагодных меркаванняў, менавіта Шыман Караль Агінскі выяўлены на карціне Рэмбранта ван Рэйна “Польскі вершнік”[103].



*Рэмбрант Харменсзан ван Рэйн “Польскі вершнік”, каля 1655 года*

*Пра паходжанне карціны не захавалася пэўных звестак. Вядома, што каля 1790-1793 года яна была перададзена Казімірам Міхалам Агінскім, гетманам вялікім літоўскім, каралю Станіславу Аўгусту Панятоўскаму і захоўвалася ў яго палацы ў Лазенках (Варшава). Пасля падзення манархіі карціну набыў князь Францішак Ксаверый Друцкі-Любецкі, пазней яна стала ўласнасцю сям’і Страйноўскіх, і, нарэшце, упрыгожыла галерэю сям’і Тарноўскіх у палацы ў Дзікове. У 1910 годзе карціна была прададзена амерыканскаму прамыслоўцу і калекцыянеру*

[103] *Broos B. P. J.* Rembrandt's Portrait … S. 218.

*мастацтва Генры Фрыку. Сёння захоўваецца ў калекцыі Фрыка ў Нью-Ёрку.*

*Сярод даследчыкаў не выклікае сумненняў аўтарства карціны, як і той факт, што Рэмбрант маляваў яе з натуры. Аднак асоба мадэлі дагэтуль застаецца дыскусійнай. Поруч з Шыманам Каралем Агінскім, у "польскім вершніку" найбольш часта бачаць яго стрыечнага брата Марцыяна Аляксандра Агінскага.*

Пасля смерці Шымана Караля Агінскага яго маёмасць была падзелена паміж сынамі Багуславам, Марцыянам і Аляксандрам. Пры гэтым маёнтак Кроні яны саступілі сваёй старэйшай сястры – дачцэ Шымана Караля ад першага шлюбу – Сафіі. Агінты, набыўшы часткі іншых братоў, атрымаў Багуслаў. Яму ж дастаўся маёнтак Рудня, у той час як Мікулін падзялілі Марцыян і Аляксандр.

Маёнтак Лёзна быў дадзены Шыманам Каралем сваёй трэцяй жонцы. Тэрэзе Война-Ясенецкай у заставу ў суме 60 000 злотых. Багуслаў, Марцыян і Аляксандр выплацілі належную суму і, вызваліўшы Лёзна з-пад застаўнага права, падзялілі маёнтак паміж сабой пароўну. Пазней частку маёнтка, якой валодаў Аляксандр, выкупіў Багуслаў Агінскі[104]. Менавіта яму ў далейшым належала мястэчка Лёзна.

[104] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 316-317.

# Багуслаў Казімір Агінскі

Багуслаў Казімір Агінскі – дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, маршалак ковенскі, стольнік вялікі літоўскі, староста бабінавіцкі і дарсунішскі.

Нарадзіўся ў 1669 годзе. Старэйшы сын Шымана Караля Агінскага, мечніка вялікага літоўскага, і Тэадоры Корсак.

У 1687 годзе названы старастай бабінавіцкім, у 1693 годзе – старастай дарсунішскім[105]. У якасці старасты дарсунішскага падпісаў элекцыю (акт выбару) Аўгуста II Моцнага (1697)[106].

Прымаў удзел у бітве пад Алькенікамі 18 лістапада 1700 г.

*Бітва пад Алькенікамі – вырашальная бітва Грамадзянскай вайны 1696-1702 гадоў у Вялікім Княстве Літоўскім - выступу магнацкіх родаў Вішнявецкіх, Радзівілаў, Пацаў і Агінскіх супраць роду Сапегаў.*

У 1701 годзе атрымаў пасаду маршалка ковенскага, якую займаў да смерці. У 1704 годзе быў прызначаны стольнікам вялікім літоўскім, аднак да 1709 года быў вымушаны саступіць гэту пасаду Юрыю Станіславу Сапегу.

Займаў паслядоўную правецінскую[107] пазіцыю. Падчас сойма 1703 года быў вызначаны да групы дэпутатаў з боку караля Аўгуста II Моцнага. Падтрымаў Сандамірскую канфедэрацыю 1704 года[108].

*У 1700 годзе Саксонія, Данія і Расія распачалі вайну са Швецыяй за валоданне прыбалтыйскімі землямі. Фармальна Рэч Паспалітая не падтрымала свайго караля, прытрымліваючыся Аліўскага міру 1660 года. Аднак Карл XII абвінавацію польскую і літоўскую шляхту ў пропуску саксонскіх войск праз сваю тэрыторыю і ў 1702 годзе ўварваўся ў межы Рэчы Паспалітай. Нанёсшы шэраг паражэнняў войскам Аўгуста II Моцнага, шведскі кароль вымусіў яго ў студзені 1704 года збегчы ў*

---

105 *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 319.

106 Elektorów poczet, którzy niegdyś głosowali na elektorów Jana Kazimierza roku 1648, Jana III. roku 1674, Augusta II. roku 1697, i Stanisława Augusta roku 1764 … S. 249.

107 Веціны – нямецкі каралеўскі і княжацкі род. Прадстаўнікі дынастыі Аўгуст II Моцны і Аўгуст III былі курфюрстамі саксонскімі і адначасова каралямі польскімі і вялікімі князямі літоўскімі.

108 Volumina Legum. Volumen Sextum : Ab Anno 1697. Ad Annum 1736. Acta Reipublicæ Continens – Warszawa : Drukarnia J. K. M. y Rzeczypospolitey, w Collegium Warszawskim Scholarum Piarum, 1739. S. 201.

*Саксонію. У Варшаве была абвешчана канфедэрацыя, якая пазбавіла Аўгуста II Моцнага ўлады. Новым каралём Рэчы Паспалітай пры падтрымцы Швецыі быў абраны Станіслаў Ляшчынскі. У адказ на гэта ў Сандаміры была абвешчана канфедэрацыя прыхільнікаў Аўгуста II Моцнага.*

Абіраўся паслом ад Ковенскага павета на соймы Рэчы Паспалітай 1718, 1724, 1726 гадоў.

За жыццё не назбіраў значнай маёмасці. Валодаў маёнткам Агінты ў Ковенскім павеце, а таксама маёнткамі Лёзна (частка з мястэчкам) і Рудня ў Віцебскім павеце.

*Пасля смерці Шымана Караля Агінскага маёнтак Лёзна быў падзелены паміж яго сынамі Багуславам, Марцыянам і Аляксандрам пароўну. Частка маёнтка, якую атрымаў Марцыян (лаўніцтвы Малькоўскае, Бельскае і Слабадское), была далучана да яго іншага ўладання – Мікуліна*[109]*. Частку маёнтка, якой валодаў Аляксандр, неўзабаве выкупіў Багуслаў.*

*Пазней шэраг лёзненскіх лаўніцтваў у старэйшага брата набыў Марцыян. У далейшым ён навечна падараваў гэтыя лаўніцтвы "сваім верным слугам": Уна – Пятру Драздоўскаму, абознаму віцебскаму, Рубяжніцы з фальваркам Чарнаручча – Стэфану Беліковічу, чашніку браслаўскаму, Станіславоў ці Замошша – Станіславу Рагазе, падстарасце барысаўскаму, лаўніцтва Заольскае – Яну Шульцу, эканому віцебскаму*[110]*.*

*Такім чынам, ва ўласнасці Багуслава Агінскага заставалася меншая частка маёнтка Лёзна з самім мястэчкам.*

*Іншае ўладанне Багуслава Агінскага ў Віцебскім павеце – маёнтак Рудня – складалася з самаго горада, а таксама Лобаўскага, Шэравіцкага і Саланецкага лаўніцтваў*[111]*.*

*На працягу амаль усяго жыцця быў уцягнуты ў спрэчку за права валодання Стравенікамі ў Ковенскім павеце. Яшчэ ў 1691 годзе Шыман Караль Агінскі, не маючы магчымасці сплачваць даўгі, якімі быў абцяжараны маёнтак, адмовіўся ад права валодання ім за 300 000 тысяч злотых на карысць Казіміра Яна Сапегі, ваяводы віленскага. Адразу*

---

[109] Историко-юридические материалы … Выпуск 18, Витебск: Типо-Литография Г.А.Малкина, 1888. С. 341.
[110] *Ibidem*, С. 350.
[111] Историко-юридические материалы … Выпуск 25, Витебск: Типо-Литография Г.А.Малкина, 1894. С. 65-79.

*пасля смерці бацькі ў 1699 годзе, Багуслаў, Марцыян і Аляксандр Агінскія запатрабавалі прызнаць продаж Стравенікаў несапраўдным, і дамагліся прыняцця пастанаўлення, паводле якога атрымлівалі права на вяртанне спадчыны з абавязкам выплаты Сапегу 300 000 тысяч злотых*[112]*. Справа была вырашана толькі ў 1728 годзе дэкрэтам Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага, якім Стравенікі былі прысуджаны Рахелі Выгоўскай, першым мужам якой быў Караль Агінскі, а другім - Антоній Казімір Сапега, і яе дзецям, народжаным ад Агінскага*[113].

Менавіта па загадзе ўладальніка Багуслава Агінскага праваслаўная царква Святога Мікалая ў мястэчку Лёзна 4 кастрычніка 1715 г. былаператворана ва ўніяцкую[114].



*Палідора Аўрора Ўрангель, невядомы мастак, каля 1690 года*

Тройчы ўступаў у шлюб. Першы раз ажаніўся з Палідорай Аўрорай Урангель, дачкой Вальдэмара Ўрангеля, шведскага генерал-лейтэнанта, і Крыстыны Вазаборг.

*Вальдэмар Урангель – барон, генерал-лейтэнант, фактычны камандуючы шведскімі войскамі падчас вайны з Брандэнбургам у 1674-1675 гадах. Крысціна Вазаборг – прадстаўніца знакамітага шведскага роду, унучка караля Густава II Адольфа.*

У хуткім часе першая жонка памерла, пакінуўшы мужу адзіную дачку Тэадору.

*Падчас Вялікай Паўночнай вайны Багуслаў Агінскі, які падтрымліваў анты шведскую кааліцыю, схаваў дачку Тэадору ў адным з кляштараў Вільні, адкуль у 1706 годзе яна была выкрадзена генерал-ад’ютантам Карла XII Карлам Густавам Дзюкерам. 13 кастрычніка 1707 г. Карл Густаў Дзюкер і Тэадора Агінская пабраліся шлюбам. У сям’і нарадзіліся двое дзяцей: дачка Тэадора Беата ў 1712 годзе і сын Карл Фрэдрык у 1714 годзе. Карл Густаў Дзюкер дасягнуў найвышэйшых пасадаў Швецыі – у студзені*

[112] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 316.
[113] *Ibidem*, S. 320.
[114] *Бантыш-Каменский Н.* Историческое известие о возникшей в Польше унии, с показанием начала и важнейших, в продолжении оной чрез два века, приключений паче же о бывшем от римлян и униатов на благочестивых тамошних жителей гонении. – Вильна : Типография А. Сыркина, 1866. С. 381.

*1719 года ён быў прызначаны фельдмаршалам, атрымаў тытул графа і месца ў Каралеўскім савеце. Тэадора Агінская памерла 9 верасня 1719 г. у Любеку, Карл Густаў Дзюкер – 3 ліпеня 1732 г. у Стакгольме.*

Багуслаў Агінскі неўзабаве ажаніўся другі раз з Эльжбетай Эперыяш, дачкой Крыштафа Эперыяша, падстолія ковенскага, якая за першага мужа мела Крыштафа Гружэўскага, войскага віленскага. Меў з ёй сына Караля.

Трэці раз ажаніўся ў 1719 годзе з Ганннай Даротай Уніхоўскай, для якой гэта быў чацвёрты шлюб. Першым яе мужам быў Феліцыян Скарабагаты, пісар гродскі троцкі, другім – Ян Уладыслаў Укольскі, падкаморы троцкі, трэцім – Матэўш Ромер, падкаморы троцкі[115].

Памёр у 1730 годзе. Пахаваны ў касцёле дамініканскага кляштара ў Папарчаі[116].

*Кляштар дамініканцаў у Папарчаі, заснаваны ў 1649 годзе Станіславам Бейнартам, былым скарбным вялікім літоўскім, з'яўляўся адным з духоўных і культурных цэнтраў літоўскіх зямель. У склепе касцёла былі пахаваны, між іншымі, Багуслаў Агінскі, маршалак ковенскі, які памёр у 1730 годзе і яго трэцяя жонка Ганна Дарота Ўніхоўская, якая памерла ў 1736 годзе.*

*За падтрымку манахамі паўстанняў 1830-1831 і 1863-1864 гадоў, кляштар быў ліквідаваны, яго будынкі і касцёл – знесены.*



*Ікона "Дзева Марыя Снежная" ў срэбным абкладзе, касцёл в. Папарчай, Літва*

Каталіцкая парафія ў Папарчаі была адноўлена ў 1916 годзе. У галоўным алтары дзеючага касцёла Св. біскупа Станіслава і Св. Францыска Асізскага размешчана ікона "Дзева Марыя Снежная" – спіс знакамітай іконы Божай Маці "Выратаванне рымскага народа", якую манахі-дамінікане замовілі і прывезлі з Рыма яшчэ ў XVII стагоддзі. Над іконай у галоўным алтары размешчаны срэбны абклад, зроблены на сродкі Багуслава Агінскага.

[115] *Ibidem*, S. 319.
[116] Сёння Папарчай (Paparčiai) – вёска Кайшадорскага раёна ў Каўнаўскім павеце Літвы

# Караль Агінскі

Караль Агінскі – стараста дарсунішскі.

Нарадзіўся каля 1692 года. Адзіны сын Багуслава Агінскага, маршалка ковенскага, і Эльжбеты Эперыяш.

У 1703 Багуслаў Агінскі атрымаў згоду на саступку свайму сыну Каралю Дарсунішскага староства, у 1710 годзе – таксама 9 вёсак у Ковенскім павеце[117].

У жніўні 1711 года Багуслаў Агінскі, маршалак ковенскі, заключыў дамову з Даніэлем Выгоўскім, кашталянам мінскім, аб умовах шлюбу свайго сына Караля з Рахеллю Выгоўскай. Паводле дамовы Даніэль Выгоўскі даваў дачцэ 150 000 злотых пасагу, а Багуслаў Агінскі, у сваю чаргу, абавязаўся саступіць сыну свае часткі маёнткаў Стравенікі, Лёзна, а таксама цэлы маёнтак Агінты.

Шлюб Караля Агінскага, старасты дарсунішскага, з Рахеллю Выгоўскай, дачкой Даніэля Выгоўскага, кашталяна мінскага, і Тэрэзы Друцкай-Сакалінскай, адбыўся ў 1712 годзе. За атрыманы пасаг муж забяспечыў сваёй жонцы 300 000 злотых на частках маёнткаў Стравенікі, Лёзна, а таксама цэлым маёнтку Агінты.

У сям'і нарадзіліся двое дзяцей: сын Юзэф у 1713 годзе і дачка Антаніна ў 1714 годзе.

У 1715 годзе Багуслаў Агінскі паўторна саступіў Дарсунішскае староства свайму сыну Каралю Агінскаму і яго жонцы Рахелі Выгоўскай.

Каля 1716 года Караль Агінскі памёр[118].

Удава па ім Рахель Выгоўская ў 1717 годзе паўторна выйшла замуж за Антонія Казіміра Сапегу, старасту мерацкага.

Яна адмовілася ад правоў на Дарсунішскае староства, адначасова атрымаўшы ад Багуслава Агінскага запэўненне перадаць яго свайму ўнуку Юзэфу Агінскаму. Дэкрэтам Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага ад 29 студзеня 1728 г. Рахелі Выгоўскай з дзяцьмі ад першага мужа Караля Агінскага быў прысуджаны маёнтак Стравенікі.

Памерла ў Вільні 23 лістапада 1739 г.[119]

---

117 *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 319.
118 *Ibidem,* S. 320.
119 *Ibidem,* S. 320.

## Юзэф Агінскі

Юзэф Агінскі – стараста дарсунішскі.

Нарадзіўся ў 1713 годзе. Адзіны сын Караля Агінскага, старасты дарсунішскага, і Рахелі Выгоўскай.

Пасля смерці свайго дзеда Багуслава Агінскага ў 1730 годзе атрымаў Дарсунішскае староства, якое ў 1732 годзе аддаў у арэнду Ганне Дароце Ўніхоўскай[120].

4 мая 1738 года ажаніўся з Апалоніяй Выгоўскай, дачкой Юрыя Выгоўскага, падчашага валынскага, і Алены Чарноўскай, якая пасля смерці бацькоў знаходзілася пад апекай свайго дзядзькі Даніэля Выгоўскага, кашталяна мінскага. Меў з ёй сына Караля, а таксама дачок Ганну, Канстанцыю, Рахель, Кацярыну.

*Караль Агінскі – стараста вайгоўскі[121]. Навучаўся ў элітарнай школе езуітаў у Вільні, пазней – у шляхецкім калегіўме тэатынаў у Варшаве. Браў актыўны ўдзел у тэатральных пастаноўках. Памёр у маладым узросце падчас навучання ў Варшаве ў ліпені 1760 года.*

*Усе чатыры дачкі Юзэфа Агінскага ад першага шлюбу прысвяцілі сябе Богу: Ганна ў 1756 годзе, Канстанцыя ў 1759 годзе і Кацярына ў 1775 годзе ўступілі ў кляштар Ордэна манашак Святога Бенедзікта (бенедзікцінак) у Коўне, Рахель у 1773 годзе – ў кляштар Ордэна Адведзінаў Найсвяцейшай Дзевы Марыі (візітак) у Вільні.*

8 студзеня 1740 г. запісаў жонцы 200 000 злотых на сваіх маёнтках Стравенікі, Агінты, Кроні ў Троцкім павеце, а таксама Рудня і Лёзна ў Віцебскім павеце. У тым жа годзе Юзэф Агінскі меў судовы працэс з Міхалам Антоніем Сапегай, лоўчым вялікім літоўскім, аб спадчыне сваёй маці Рахелі Выгоўскай, разам з ім выплаціў даўгі маці і айчыма, і, нарэшце, узяў у заставу прыналежны ім маёнтак Баркалабава ў Мсціслаўскім павеце. Яшчэ ў тым жа 1740 годзе Юзэф Агінскі і яго жонка Апалонія Выгоўская набылі ў Гутакоўскіх маёнтак Кераголішкі ў Троцкім павеце.

120 *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 321.

121 Вайгова (Vaiguva) – населены пункт у складзе Дарсунішскага староства, сёння – вёска ў Кельмескім раёне Шаўляйскага павета Літвы.

Апалонія Выгоўская памерла ў Стравеніках у красавіку 1751 года[122].

15 верасня таго ж года Юзэф Агінскі ажаніўся другі раз з Антанінай Белазор, дачкой Матэўша Белазора, старасты кернаўскага, і Ганны Агінскай. Меў з ёй сына Ігнацыя, дачок Алену-Вікторыю, Магдалену і Ганну.

Стала пражываў у палацы ў Стравеніках. Валодаў маёнткамі Стравенікі, Агінты, Кроні ў Троцкім павеце, Рудня і Лёзна ў Віцебскім павеце.

1 студзеня 1757 г. у Лёзне зрабіў запіс, якім устанавіў Руднянскім і Лёзненскім рабінам на 12 год Ульфа Іршавіча Іцкавіча[123].

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе адмовіўся складаць прысягу на вернасць Кацярыне II, у выніку чаго яго ўласныя маёнткі Лёзна (мястэчка з 16 вёскамі) і Рудня (мястэчка з 37 вёскамі) былі секвестраваны і перададзены ў казённае кіраванне[124].

Памер 21 студзеня 1776 г. Пахаваны 28 сакавіка 1776 г. у дамініканскім касцёле Святога Духа ў Вільні. Казанне на пахаванні прамовіў айцец Дамінік Прашкоўскі[125].



*Дамініканскі касцёл Святога Духа ў Вільні*

*Адам Кіркор у кнізе “Прагулкі па Вільні і яе ваколіцах”(1856 год), прыводзіць наступныя звесткі пры апісанні дамініканскага касцёла Святога Духа: “ ... вялікія скляпы пад касцёлам да гэтага дня поўныя памерлых. Наведваючы гэтыя скляпы некалькі гадоў таму, я бачыў некаторыя целы, а нават адзенне, не кранутыя распадам, прычынай чаго была вялікая сухасць месца. Асабліва ... пояс на*

[122] *Ibidem,* S. 321.
[123] Историко-юридические материалы … Выпуск 19, Витебск: Типо-Литография Г.А.Малкина, 1889. С. 130-131.
[124] Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов. Том 3. – Минск : Издательство Академии наук БССР, 1961. С. 41.
[125] *Proszkowski Dominik X.* Kazania na Pogrzebie Jmci Pana Józefa na Kozielsku Ogińskiego Starosty Dorsuniskiego. Mi.ane w Wilnie w Kościele XX. Dominikanów.Wilno : Drukarnia XX. Schol. Piarum., 1776. s. 38.

*князі Агінскім з Казельска, абсалютна цэлы, а з-пад аксамітнай шапкі, атарочанай собалямі, дзіўна выглядае голы чэрап. Каля труны была металічная табліца з гербам і надпісам: "Месца смяротных парэшткаў годнага несмяротнай памяці Юзэфа на Казельску Князя Агінскага Старасты Дарсунішскага. Памёр у год Панскі 1776 дня 21 студзеня ва ўзросце 65 год"*[126].

Удава па Юзафе Агінскім Антаніна Белазор памерла ў Стравеніках 21 мая 1812 г. ва ўзросце 84 гадоў[127].

---

[126] *Kirkor Adam* Przechadzki po Wilnie i jego okolicach. Wilno : Drukarnia A. Marcinowskiego, 1856. S. 65.
[127] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 321.

## Ігнацый Агінскі

Ігнацый Агінскі – стараста вайгоўскі і дарсунішскі.

Нарадзіўся ў 1755 годзе. Адзіны сын Юзэфа Агінскага, старасты дарсунішскага, і Антаніны Белазор[128].

Пасля смерці бацькі ў 1776 годзе ўспадкаваў маёнткі Стравенікі ў Троцкім павеце, Агінты і Кроні ў Ковенскім павеце, Лёзна і Рудня ў Віцебскім павеце[129].

У 1779 годзе пабраўся шлюбам з Юзэфай Агінскай, дачкой Андрэя Ігнацыя Агінскага, ваяводы троцкага, і Паўліны Шэмбек, сястрой Міхала Клеафаса Агінскага. Меў з ёй дачку Паўліну і сына Габрыэля, які нарадзіўся ў 1784 годзе.

Кавалер ордэна Святога Станіслава[130].

Доўга хварэў. Памёр у 1786 ці 1787 годзе. Пахаваны ў некропалі бернардзінскага кляштара ў Вільні.[131]

Неўзабаве пасля смерці Ігнацыя Агінскага маёнткі Лёзна і Рудня былі ўнесены яго сястрой Магдаленай Агінскай свайму мужу Юзэфу Храпавіцкаму.

Магдалена Агінская – дачка Юзэфа Агінскага, старасты дарсунішскага, і Антаніны Белазор, сястра Ігнацыя Агінскага. Каля 1775 года пабралася шлюбам з Юзэфам Храпавіцкім, старастай судовым старадубаўскім, пазней – інстыгатарам вялікім літоўскім. Паводле тэстамента (духоўнага завяшчання) бацькі ўспадкавала 200 тысяч злотых. У далейшым унесла мужу маёнткі Лёзна і Рудня[132].

Такім чынам, ад 1790 года Лёзна перайшло ва ўласнасць роду Храпавіцкіх[133].

---

[128] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 322.

[129] Потомство Рюрика. Материалы для составления родословий. Том I. Князья Черниговские. Часть 1-я. / сост. Г.А. Власьев. – С. Пб. : Т-во Р. Голике и А. Вильборг, 1906. С. 333.

[130] Ордэн Святога Станіслава быў устаноўлены Станіславам Аўгустам Панятоўскім 7 мая 1765 г., займаў другое месца ў іерархіі ордэнаў Рэчы Паспалітай (пасля ордэна Белага Арла).

[131] *Pacevičius A.* Ignoto Oginskio (1755–1786) Biblioteka: genealoginio ir religinio tapatumo atspindys // Knygotyra. Vol. 72, 2019. S. 98.

[132] *Wolf Józef* Kniaziowie litewsko-ruscy ... S. 322.

[133] Lozna, [w:] Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajow slowianskich, t. V. – Warszawa 1884, S. 765.



*Партрэт Юзэфы Агінскай, адбітак гравюры па медзі,*
*выкананай яе другім мужам Янам Нікадзімам Лапацінскім*

# Юзэф Храпавіцкі



Храпавіцкія – беларускі шляхецкі род герба Газдава, пачынальнікам якога быў Фёдар Міхайлавіч, харунжы віцебскі ад 1562 года, падкаморы віцебскі ад 1576 года. Жонка Алена Сенькаўна, дачка Сенькі Дашковіча, гараднічага віцебскага, унесла яму маёнтак Храпавічы[134] ў Лужаснянскай воласці. Ад назвы гэтага ўладання і атрымалі прозвішча іх нашчадкі[135].

Юзэф Храпавіцкі – дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, стараста старадубскі, інстыгатар вялікі літоўскі, пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі – маршалак шляхты *(рас. предводитель дворянства)* Полацкай губерні.

Нарадзіўся каля 1750 года. Сын Яўстафія Юзэфа Храпавіцкага, інстыгатара вялікага літоўскага, і Тэрэзы Неміровіч-Шчыт.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе бацька перадаў яму маёнткі, якія апынуліся ў складзе Расійскай імперыі[136].

Займаў пасады старасты судовага старадубскага, ад 1781 года – старасты старадубскага.

*Старадубскі павет быў створаны ў 1626 годзе ў складзе аднаўленага Смаленскага ваяводства. У выніку вайны 1654-1667 гадоў усходнія землі Вялікага Княства Літоўскага канчаткова адышлі да Расійскай дзяржавы. Урады Старадубскага павета ад гэтага часу насілі намінальны характар.*

Абіраўся паслом на соймы Рэчы Паспалітай 1780[137] і 1784[138] гадоў ад Старадубскага павета.

---

[134] Сёння Храпавічы – вёска ў Мазалаўскім сельскім савеце Віцебскага раёна.
[135] Diariusz / Jan Antoni Chrapowicki. Cz. 1 : Lata 1656-1664 / oprac. i wstępem poprzedził Tadeusz Wasilewski. – Warszawa : Inst. Wydaw. PAX, 1978. S. 13.
[136] Złota księga szlachty polskiej. Rocznik III / przez Teodora Żychlińskiego . Poznan : Jarostaw Leitgeber, 1881. – S. 37.
[137] Dyaryusz Seymu Ordyngo [!] Warszawskiego Roku 1780 Dnia 2go Pazdziernika Zaczętego, z Wyrażeniem Posłow, Sessyi, Projektow, Mow, &c., Grodno 1780, S. 8.

У траўні 1780 года быў у ліку асоб з польскага боку, якія суправаджалі расійскую імператрыцу Кацярыну II падчас наведвання Полацка[139].

Пасля зыходу ў адстаўку бацькі Яўстафія Юзэфа Храпавіцкага ў 1785 годзе – інстыгатар вялікі літоўскі[140]. Займаў гэту пасаду да 1792 года.

У 1793-1796 гадах – маршалак шляхты *(рас. предводитель дворянства)* Полацкай губерні ў складзе Расійскай імперыі.

У 1777 годзе быў узнагароджаны ордэнам Святога Станіслава. У 1786 годзе стаў кавалерам ордэна Белага Арла[141].

Тройчы ўступаў у шлюб. Першы раз ажаніўся з Францішкай Грынявецкай, з якой неўзабаве развёўся. Меў з ёй дачку Юзэфу.

Паўторна ажаніўся з Магдаленай Агінскай, дачкой Юзэфа Агінскага, старасты дарсунішскага, і Апалоніі Выгоўскай, якая ўнесла мужу маёнткі Лёзна і Рудня ў Віцебскім павеце. Меў з ёй трох сыноў: Антонія, Міхаіла і Яўстафія.

Пасля смерці другой жонкі пабраўся шлюбам у трэці раз – з Ганнай Радзівіл, дачкой Мікалая Радзівіла, генерал-маёра арміі Вялікага Княства Літоўскага, і Францішкі Бутлер, якая за першага мужа мела Юзэфа Нарбута, харунжага лідскага[142].

Валодаў маёнткамі Лёзна і Рудня ў Віцебскім павеце, Юхавічы, Празарокі і Каханавічы ў Полацкім ваяводстве, Датнова і Цярэспаль ў Ковенскім павеце, Байсагала ў Шавельскім павеце і Яснагорка ў Расіёнскім павеце (Жамойць)[143].

---

138 Dyaryusz Seymu Wolnego Ordynaryinego Grodzienskiego Szescioniedzielnego Roku Panskiego MDCCLXXXIV. Dnia 4. Miesiąca Pazdziernika Oprawującego Się. Warszawa 1785, S. 4.

139 Полоцко-Витебская Старина. Издание Витебской ученой архивной комиссии. – Витебск : Типография Насл. М.Б. Неймана, 1916. – Т. III. – С. 64.

140 Інстыгатар вялікі літоўскі – ураднік у Вялікім Княстве Літоўскім, які выконваў функцыі галоўнага пракурора дзяржавы. Ініцыяваў разгляд і вёў следства па справах аб злачынствах супраць дзяржавы і годнасці вялікага князя, наглядаў за прыбыткамі са сталовых маёнткаў.

141 Найвышэйшы ордэн Рэчы Паспалітай, устаноўлены Аўгустам II Моцным 1 лістапада 1705 г.

142 *Uruski S.* Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. Warszawa : Gebethner i Wolff, 1904. – T. I. – S. 251.

143 Złota księga szlachty polskiej. Rocznik V / przez Teodora Żychlińskiego . Poznan : Jarostaw Leitgeber, 1883. – S. 29.

*Менавіта на час, калі Лёзнам валодаў Юзэф Храпавіцкі, прыпала рэвізійная паездка ў Беларускую губерню Гаўрылы Раманавіча Дзяржавіна ў 1800 годзе. Перад сенатарам была пастаўлена задача выявіць прычыны голаду, які ахапіў край, і прыняць рашучыя меры па яго пераадоленні. Адным з першых мерапрыемстваў Дзяржавіна стала забарона вінакурэння (вытворчасці спірту і спіртных напояў), якое памяншала і без таго недастатковыя запасы хлеба.*

*Выявіўшы ў Лёзне вінакурэнне, якое ажыццяўлялася яўрэямі пад іменем уладальніка мястэчка памешчыка Храпавіцкага, сенатар адразу накіраваўся на месца. Тут ён апячатаў вінакурню з яе абсталяваннем, а са знойдзеных запасаў хлеба частку пакінуў для харчавання яўрэям, частку адправіў у Сураж для раздачы патрабуючым мяшчанам, а астатні хлеб загадаў раздаць жыхарам навакольных вёсак, якія мелі ў ім пільную патрэбу[144]. Усё гэта было здзейснена на вачах Шнеура Залмана, які ў гэты час пражываў у Лёзне[145].*

*Рэакцыя яўрэйскай абшчыны не прымусіла сябе доўга чакаць. Не паспеў Дзяржавін вярнуцца ў Пецярбург, як імператару паступіла скарга на яго ад адной яўрэйкі з Лёзна, якая сцвярджала, што падчас знаходжання на вінакураным заводзе, ён "смертельно бил ее палкою, от чего она, будучи чревата, выкинула мёртвого младенца". Па выніках разгляду скаргі сенатар быў апраўданы, а яўрэй, які пісаў яе, прыгавораны да аднаго года пазбаўлення волі (быў вызвалены праз тры месяцы па хадатайніцтве самаго Дзяржавіна).*

*У першай палове XIX стагоддзя ў Вільні хадзіў анекдот, зафіксаваны пісьменнікам Станіславам Мараўскім:*

*Юзэф Храпавіцкі, інстыгатар вялікі літоўскі, пан адукаваны і заможны, жыў з сям'ёй у Вільні, і на патрэбы свайго дому набываў у прылеглых фальварках разнастайныя прадукты. Эканом аднаго з такіх фальваркаў у падобных выпадках заўсёды пісаў да яго: "Пасылаю Я[сна] В[яльможнаму] Пану качак столькі, курэй столькі, індыкоў столькі, з якімі застаюся ЯВПана пакорлівым слугой". Інстыгатара гэта спачатку забаўляла, потым стаміла. А так як раней паны адчувалі абавязак цывілізаваць сваіх слуг, калі аднойчы гэты эканом апынуўся ў Вільні, інстыгатар патлумачыў, што ён робіць смешна, дадаючы*

---

[144] Сочинения Державина с объяснительными примечаниями Я. Грота. Том 6. Переписка (1794-1816) и «Записки». – СПб. : Типография Императорской Академии Наук, 1871. С. 390

[145] Сочинения Державина с объяснительными примечаниями Я. Грота. Том 7. Переписка (1794-1816) и «Записки». – СПб. : Типография Императорской Академии Наук, 1872. С. 253.

*заўсёды ў сваіх лістах "з якімі застаюся", бо ніхто з індыкамі не застаецца нічыім пакорлівым слугой. Заўвага была прынята да ведама. Наступнага разу эканом выправіўся, і напісаў такі ліст: "ЯВПане, пасылаю для Вашага стала індыкоў дванаццаць, каплуноў дзесяць, парасят чатыры. Яек не пасылаю, без якіх застаюся ЯВПана пакорлівым слугой"*[146]

Памёр 25 лютага 1812 года[147].

Пасля смерці Юзэфа Храпавіцкага яго маёмасць успадкавалі сыны Антоній, Міхаіл і Яўстафій. Маёнткі Лёзна і Рудня, аб'яднаныя ў адзіны гаспадарчы арганізм, былі падзелены паміж імі пароўну – кожны з братоў атрымаў па адной трэцяй частцы.

---

[146] *Morawski, Stanisław.* Kilka lat młodości mojej w Wilnie (1818-1825) / Opracowali i wstępem poprzedzili Adam Czartkowski i Henryk Mościcki. – Warszawa : Instytut Wydawniczy „Biblioteka Polska", 1924. S. 400.

[147] *Wolf Józef* Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego 1386–1795. – Kraków : Drukarnia WL. L. ANCZYCA I SPÓLKI, 1885. S. 220.

## Антоній, Міхаіл і Яўстафій Храпавіцкія

Пасля смерці Юзэфа Храпавіцкага кожны з яго сыноў стаў уладальнікам адной трэцяй часткі маёнткаў Лёзна і Рудня.

### Антоній Храпавіцкі

Антоній Храпавіцкі – граф, палкоўнік, прэзідэнт I дэпартамента Галоўнага суда Віленскай губерні.

Нарадзіўся каля 1775 года. Старэйшы сын Юзэфа Храпавіцкага, інстыгатара вялікага літоўскага, і Магдалены Агінскай.

Ад 1775 года харунжы, ад 1779 года паручнік II Нацыянальнай кавалерыйскай брыгады Вялікага Княства Літоўскага. Пасля расфарміравання брыгады ў 1795 годзе ў чыне паручніка ўступіў у Кавалергардскі полк Расійскай імперыі. Тут ажаніўся з дачкой генерала кавалергардаў Кожына. У хуткім часе пакінуў полк і развёўся з жонкай[148].

Мальтыйскі рыцар, кавалер Гонару і Адданасці[149].

*Рыцары гэтай катэгорыі не прымалі абетаў, але бралі на сябе абавязацельствы весці прыкладны хрысціянскі лад жыцця і прымаць актыўны ўдзел у доглядзе за хворымі і сацыяльнай дапамозе, якую аказваў Ордэн.*

Падчас вайны 1812 года – адзін з найбольш актыўных прыхільнікаў Напалеона ў Вялікім Княстве Літоўскім. Палкоўнік, кіраўнік жандармерыі Віленскага дэпартамента[150]. Сябра Ваеннага камітэта[151]. Сябра віленскага муніцыпальнага савета[152].

*1 ліпеня 1812 г. Напалеонам была створана Камісія часовага ўрада Вялікага Княства Літоўскага – адміністрацыйны орган, кампетэнцыя якога распаўсюджвалася на Віленскую, Гродзенскую, Мінскую і Беластоцкую губерні, перайменаваныя ў дэпартаменты.*

---

[148] *Dariusz Nawrot* Litwa i Napoleon w 1812 roku, Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego, Katowice 2008, S. 600.
[149] *Stefan Krzysztof Kuczyński (red.)* : Zakon Maltanski w Polsce. Warszawa : DiG, 2000, S. 196
[150] *Dariusz Nawrot* Litwa i Napoleon … S. 600.
[151] *Ibidem*, S. 483.
[152] *Ibidem*, S. 320.

*У ліку галоўных задач Камісіі было фарміраванне жандармерыі для выканання паліцэйскай службы, аказання вайсковай дапамогі прадстаўнікам публічнай улады, а таксама затрымання марадзёраў і дэзерціраў. На чале жандармерыі дэпартаментаў прызначаліся палкоўнікі жандармерыі.*

*Адным з аддзелаў Камісіі часовага ўрада стаў Ваенны камітэт, задачай якога было фарміраванне войска Вялікага Княства Літоўскага.*

*Французскімі ўладамі ўводзілася новая сістэма кіравання гарадамі. У склад муніцыпалітэта Вільні ўваходзілі мэр горада, чатыры яго памочнікі і дванаццаць сяброў муніцыпальнага савета.*

Корпус жандармерыі Віленскага дэпартамента складаўся з 644 чалавек. Жандары не толькі выконвалі паліцэйскія функцыі, забяспечвалі дастаўку зброі, правіянту і фуражу, але і бралі ўдзел у вайсковых аперацыях. Пасля паражэння напалеонаўскіх войск, Антоній Храпавіцкі разам са сваім аддзелам адступіў на захад, і толькі пад Ляйпцыгам[153], узяты ў палон, адмовіўся ад справы імператара французаў[154].

Неўзабаве пасля гэтага вярнуўся на Радзіму. Ад 1814 года браў удзел у працы Галоўнага камітэта ваенных павіннасцяў, які ажыццяўляў улік страт, панесеных грамадзянскім насельніцтвам на карысць расійскай арміі ў 1812 годзе[155].

У далейшым быў абраны прэзідэнтам I (крымінальнага) дэпартамента Галоўнага суда Віленскай губерні.

*Паводле рэформы 1801 года ў кожнай губерні былі створаны Галоўныя суды ў складзе крымінальнага і грамадзянскага дэпартаментаў.*

Спаўняў абавязкі прэзідэнта другога аддзела Віленскага Таварыства дабрачыннасці. Ад моманту заснавання ў 1816 годзе ўваходзіў у склад Дырэкцыі Віленскага тэатра. Не толькі арганізоўваў прадстаўленні тэатра на карысць убогіх, якімі апекавалася Віленскае Таварыства дабрачыннасці, але сам выступаў у ролі драматурга і кампазітара.

---

[153] Бітва пад Ляйпцыгам ці Бітва народаў 16-19 кастрычніка 1813 г. – буйнейшая бітва Напалеонаўскіх войнаў, у якой імператар французаў пацярпеў паразу ад саюзных армій Расіі, Аўстрыі, Прусіі і Швецыі.

[154] *Morawski, Stanisław.* Kilka lat młodości mojej … S. 390.

[155] *Ibidem,* S. 466.

*З'яўляўся аўтарам камедыі "Авантура на зялёным мосце, ці Магнетыст, вучань Мэсмэра", у якой высмейваў захапленне магнетызмам у тагачасным грамадстве.*

*25 красавіка 1829 г. у Вільні адбылася пастаноўка двух арыгінальных камедый, напісаных Антоніем Храпавіцкім на польскай мове: "Перарваная інтрыга" і "Жывы вобраз". Прадстаўленне завяршылася агульным спевам акторамі "Хора" – верша Антонія Горацкага, пакладзенага на музыку аўтарам п'ес*[156].

Выступаў упаўнаважаным прадстаўніком Міхала Клеафаса Агінскага па юрыдычных пытаннях. Пасля ад'езду апошняга за мяжу ў 1822 годзе, звяртаўся ў суд для перадачы яго маёнткаў на задавальненне патрэб разнастайных крэдытораў[157].

Валодаў маёнткамі Датнова і Цярэспаль ў Ковенскім павеце, Байсагала ў Шавельскім павеце і трэцяй часткай маёнткаў Лёзна і Рудня ў Віцебскім павеце[158].

Тройчы ўступаў у шлюб. Першы раз ажаніўся падчас знаходжання ў расійскім Кавалергардскім палку з дачкой генерала Кожына. У хуткім часе развёўся з ёй.

Паўторна пабраўся шлюбам у 1810 годзе з Юзэфатай Вольскай з роду Кмітаў, якая неўзабаве памерла.

Нарэшце ажаніўся ў трэці раз з княжной Эвелінай Святаполк-Мірскай, дачкой Станіслава Войцэха Мірскага, пісара вялікага літоўскага, і Станіславы Кошчыц. Меў з ёй дачку Антаніну, сыноў Адама і Габрыэля, а таксама дачку Станіславу.

Эвеліна Святаполк-Мірская была фрэйлінай імператарскага двара, дзякуючы чаму мела значную падтрымку расійскіх уладаў.

*Антоній Храпавіцкі з жонкай Эвелінай Святаполк-Мірскай некалькі разоў прымалі ў сябе ў Датнове расійскую імператрыцу Елізавету Аляесееўну, жонку Аляксандра I*[159].

Не браў актыўнага ўдзелу ў паўстанні 1830-1831 гадоў. Затое роля яго жонкі ў названых падзеях была заўважнай.

---

156 Kurier Litewski. – 1829, 24 maja. – № 62. – S. 1.
157 Kurier Litewski. – 1824, 27 pazdziernika. – № 127. – S. 6.
158 Złota księga szlachty polskiej. Rocznik trzeci / przez Teodora Żychlińskiego. W Poznaniu : Jarostaw Leitgeber, 1881. – S. 37.
159 Datnów, [w:] Słownik geograficzny Królestwa Polskiego, t. I: Aa – Dereneczna, Warszawa 1880, S. 911.

*У пачатку красавіка 1831 года павятовы горад Ашмяна быў заняты паўстанцкім аддзелам пад камандаваннем палкоўніка Караля Пшэздзецкага. У выніку гэтага была перарвана сувязь Вільні з цэнтральнымі губернямі імперыі. Для падаўлення паўстання ў Ашмяну былі накіраваны расійскія войскі пад камандаваннем палкоўніка Пятра Вярзіліна. Карны аддзел падышоў да горада 15 красавіка 1831 г. Пасля непрацяглай бітвы з тылавым аддзелам паўстанцаў, асноўныя сілы якіх адышлі да Налібоцкай пушчы, расійскія войскі падпалілі горад і распачалі расправу з мірнымі жыхарамі. У выніку разні былі забіты некалькі соцень чалавек, у тым ліку жанчыны і дзеці, якія хаваліся ў дамініканскім касцёле.*

*Праз некалькі дзён салдаты, якія ўдзельнічалі ў карнай экспедыцыі, з'явіліся ў Вільні, дзе на вуліцах горада выставілі на продаж акрываўленае адзенне, упрыгожванні, вырваныя з часткамі цела, і касцельныя прыналежнасці. Даведаўшыся аб гэтым, Эвеліна Храпавіцкая загадала набыць некалькі пар завушніц з вушамі і пярсцёнкаў з пальцамі і, напоўніўшы імі куфэрак, паслала да літоўскага генерал-губернатара Мацвея Яўграфавіча Храпавіцкага, з наступным лістом:*

*"Пасылаю Табе парэшткі мучанікаў, якія клічуць да помсты! Памятай, што голас безабаронных, дзяўчат, дзяцей, старых і святароў, голас 360 мучанікаў павінен выклікаць помсту на таго, хто здзейсніў такую разню, калі не з неба, то з бяздоннага пекла.*

*Не! Гэта не салдаты здзейснілі злачынства, гэта губернатар, гаспадар правінцыі, без волі якога нічога не можа стацца. Ты маеш абсалютную ўладу, вырві маё жыццё, чакаю на гэта спакойна, але з вечнай пагардай да нікчэмнага забойцы. Ева з князёў Мірскіх графіня Храпавіцкая".*

*Невядома, ці гэты ліст сапраўды быў напісаны, як і адказ губернатара, але іх копіі хадзілі па Вільні і перапісваліся жыхарамі горада.*

*"Пані! Ці ж гэта мая віна? Гэта здзейснілі кабардзінцы; вядома, што яны варвары, аднак верныя прысязе Найяснейшаму Пану, які загадаў мне ўжыць іх для вяртання бунтаўнікоў да вернасці Яго Імператарскай Вялікасці. Застаючыся з павагай пакорлівым слугой Ясна Вяльможнай графіні, генерал-губернатар Літоўскі, ад'ютант Яго Імператарскай Вялікасці Храпавіцкі. P.S. Парэшткі трупаў вяртаю"*[160].

[160] Pamiętniki polskie / zebrane przez Ksawerego Bronikowskiego. T. 1. Przemyśl : Adam Kaczurba, 1883. S. 244-245.

Апошнія 20 гадоў жыцця Антоній Храпавіцкі правёў ва ўласным маёнтку Датнова. Імкнуўся ўзвысіць яго за кошт развіцця рамёстваў – пабудаваў дыхтоўныя дамкі і запрасіў з-за мяжы рамеснікаў, якія, аднак, вымушаны былі ў хуткім часе пакінуць мястэчка з прычыны адсутнасці заказаў і збыту прадукцыі[161].

Памёр 14 лістапада 1851 г. у Рызе. Пахаваны на мясцовых каталіцкіх могілках[162].

## Міхаіл Храпавіцкі

Міхаіл Храпавіцкі – граф, падкаморы бабінавіцкі, маршалак шляхты (*рас. предводитель дворянства)* Дзісенскага павета[163], палкоўнік паўстання 1830-1831 гадоў, старшыня Мінскага губернскага межавага суда.

Нарадзіўся каля 1790 года. Другі сын Юзэфа Храпавіцкага, інстыгатара вялікага літоўскага, і Магдалены Агінскай.

Паручнік. Кавалер Мальтыйскага Ордэна.

У 1815-1816 гадах згадваецца ў дакументах як падкаморы бабінавіцкі[164].

*Бабінавіцкі павет існаваў у 1777-1796 і 1802-1840 гадах. Падкаморскія суды разглядалі памежныя спрэчкі землеўласнікаў, ствараліся ў кожным павеце і складаліся з аднаго ўрадніка – падкаморыя, які наймаў сабе аднаго ці двух памочнікаў – каморнікаў і пісара. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай падкаморскія суды былі ліквідаваны, у 1797 годзе – адноўлены. Канчаткова ліквідаваны ў 1832 годзе*[165].

У 1820-1826 гадах – маршалак шляхты *(рас. предводитель дворянства)* Дзісненскага павета.

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў паўстання 1830-1831 гадоў у Дзісненскім павеце. Палкоўнік, камандуючы кавалерыяй узброеных сіл паўстанцаў Дзісненскага павета.

---

161 Datnów, [w:] Słownik geograficzny Królestwa Polskiego … S. 911.
162 Kurier Warszawski nr 312 z 24.11.1851 i nr 322 z 04.12.1851.
163 Сёння Дзісна – горад у Мёрскім раёне Віцебскай вобласці.
164 Kurier Litewski. – 1815, 30 czerwca. – № 52. – S. 10.
165 Вялікае княства Літоўскае : Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2 … С. 383.

*Паўстанне ахапіла Дзісненскі павет у красавіку 1831 года. Цэнтрам фарміравання ўзброеных сіл паўстанцаў стала мястэчка Лужкі, размешчанае на поўдзень ад павятовага цэнтра, куды на працягу 23-27 красавіка з'ехаліся больш за дзве тысячы мясцовых жыхароў. Камандуючым войскамі быў прызначаны Валенцій Брахоцкі. Міхаіл Храпавіцкі, узведзены ў ранг палкоўніка, узначаліў кавалерыю паўстанцаў.*

*Пасля завяршэння фарміравання вайсковага аддзела, было прынята рашэнне пра захоп павятовага цэнтра. Паўстанцы былі падзелены на дзве часткі. Першую складаў пяхотны батальён Томаша Лапацінскага з часткай кавалерыі пад камандаваннем Міхаіла Храпавіцкага. Ім было загадана ісці проста да Дзісны паштовым трактам з Глыбокага для далейшай атакі горада з поўдня. Іншая частка паўстанцаў пад камандаваннем Брахоцкага павінна была пераправіцца праз раку Дзісну, абысці горад, і атакаваць яго з поўначы.*

*Першым да Дзісны прыбыў кавалерыйскі аддзел Міхаіла Храпавіцкага. Атрымаўшы ад перавозчыка фальшывыя звесткі аб тым, што расійскія войскі пакінулі горад, і не чакаючы на сігнал аб агульным наступе, ён накіраваў на другі бераг ракі некалькі дзясяткаў добраахвотнікаў. Абаронцы Дзісны сустрэлі нападнікаў шквальным агнём: два паўстанцы былі забіты, дваццаць пяць трапілі ў палон. Пасля падыходу асноўных сіл паўстанцаў, расійскія войскі адступілі, пакінуўшы Дзісну без бою*[166]*.*

*У далейшым, перад пераўзыходзячымі сіламі непрыяцеля, паўстанцы Дзісненскага павета адышлі на захад: спачатку на тэрыторыю Літвы, а пазней перайшлі ў Прусію.*

Пасля паражэння паўстання добраахвотна здаўся расійскім уладам, быў вызвалены ад адказнасці, але аддадзены пад нагляд паліцыі.

Займаў пасаду старшыні Мінскага губернскага межавага суда[167].

*У 1810-1812 гадах у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях былі створаны межавыя суды, у кампетэнцыі якіх знаходзіліся пазямельныя спрэчкі. Межавыя суды першай інстанцыі (агульныя) складаліся з аднаго суддзі і разглядалі справы на месцы. Іх рашэнні можна было абскардзіць у павятовых судах другой інстанцыі, якія складаліся з пяці суддзяў. Для*

[166] *Dangel Stanisław* Rok 1831 w Mińszczyźnie / Stanisław Dangel. Warszawa : Kasa im. Mianowskiego, 1925. S. 39-40.

[167] У Спісе дваранаў Віленскай губерні, якія прыбылі на дваранскія выбары ў г. Вільню 1834 года названы былым старшынёй Мінскага губернскага межавага суда.

*разгляду скаргаў на рашэнні павятовых судоў у 1815 годзе былі створаны губернскія межавыя апеляцыйныя суды, члены якіх выбіраліся прадстаўнікамі дваранства па адным ад кожнага павета. Губернскія межавыя суды былі ліквідаваны ў 1840 годзе.*

Валодаў маёнткамі Яснагорка і Каранаў у Ковенскай губерні, Празарокі і Ялаўка ў Дзісненскім павеце і трэцяй часткай маёнткаў Лёзна і Рудня ў Віцебскім павеце[168]. Меў вялікія даўгі. Ужо ў 1816 годзе быў вымушаны ставіць пытанне пра падзел зямлі з братамі для задавальнення крэдытораў[169].

Двойчы ўступаў у шлюб. Першы раз ажаніўся з Янай Акушка, дачкой Казіміра Акушкі і Феліцыяны Станілевіч, якая ўнесла мужу маёнткі Цяпіна і Казіміраў у Лепельскім павеце. Меў з ёй сына Казіміра і дачку Юзэфу. Другі раз ажаніўся з Юзэфай Корсак. Меў з ёй сына Аркадзія[170].

Дата смерці і месца пахавання невядомыя.

Верагодна, падчас знаходжання на пасадзе падкаморага бабінавіцкага, пражываў у маёнтку Лёзна. Менавіта тут нарадзіўся яго сын Казімір Храпавіцкі.

*Казімір Міхайлавіч Храпавіцкі – генерал-лейтэнант Расійскай імператарскай арміі. Нарадзіўся 26 ліпеня 1817 г. у Лёзне. Старэйшы сын Міхаіла Храпавіцкага і Яны Акушка.*

*Адукацыю атрымаў у Школе гвардзейскіх падпрапаршчыкаў і кавалерыйскіх юнкераў у Санкт-Пецярбургу. У 1837 годзе залічаны афіцэрам у Лейб-гвардыі Сямёнаўскі полк, у якім праслужыў 22 гады. У 1860 годзе быў прызначаны камандуючым Бранскага пяхотнага палка (палкоўнік). Ад 1863 года – памочнік начальніка 25-й пяхотнай дывізіі (генерал-маёр). У 1873 годзе прызначаны начальнікам 34-й пяхотнай дывізіі, ад 1874 года начальнік 11-й пяхотнай дывізіі (генерал-лейтэнант).*

*Удзельнічаў у падаўленні Венгерскага паўстання 1848-1849 гадоў, Крымскай вайне 1853-1856 гадоў. З пачаткам руска-турэцкай вайны*

[168] Złota księga szlachty polskiej … S. 38.
[169] Kurier Litewski. – 1816, 1 lipca. – № 53. – S. 9-10.
[170] Złota księga szlachty polskiej … S. 38.

*1877-1878 гадоў выступіў у паход, аднак на шляху праз Бесарабію захварэў і вымушаны быў сысці ў адстаўку*[171].

*Памёр 25 красавіка 1881 г. у Варшаве. Пахаваны на Паванзкоўскіх могілках.*

## Яўстафій Храпавіцкі

Яўстафій Храпавіцкі – граф, падкаморы шавельскі[172], камер-юнкер расійскага імператарскага двара[173], старшыня Віцебскага губернскага суда.

Малодшы сын Юзэфа Храпавіцкага, інстыгатара вялікага літоўскага, і Магдалены Агінскай.

У 1812 годзе прызначаны падкаморым шавельскім.

Камер-юнкер расійскага імператарскага двара.

Ад 1817 года старшыня Віцебскага губернскага суда.

Валодаў маёнткамі Каханавічы і Юхавічы ў Дрысенскім павеце, Байсагала ў Шавельскім павеце і трэцяй часткай маёнткаў Лёзна і Рудня ў Віцебскім павеце[174].

Быў жанаты з Амеліяй Горскай, дачкой Станіслава Аўгуста Горскага, пісара скарбовага літоўскага, і Ганны Неміровіч-Шчыт. Меў з ёй сыноў Юстыніана, які памёр у маладым узросце, Ігнацыя, дачок Амелію і Марыю.

Памёр у 1836 годзе. Пахаваны на могілках Росы ў Вільні.

Абставіны пераходу права ўласнасці на Лёзна ад Храпавіцкіх застаюцца нявысветленымі. Наступным вядомым уладальнікам маёнтка і мястэчка выступае Ігнацый Францавіч Шэбека.

---

[171] Русский биографический словарь / Изд. под наблюдением пред. Имп. Рус. ист. о-ва А.А. Половцова. Т. 21. – Санкт-Петербург : Типография В. Безобразова и К°, 1901. С. 421.

[172] Шавельскі павет – адміністрацыйная адзінка Ковенскай губерні, існаваў у 1795-1920 гадах. Павятовы горад – Шаўлі.

[173] Камер-юнкер – прыдворны ўрад у Расійскай імперыі, першапачаткова – службовая асоба, абавязкі якой зводзіліся да прысутнасці пры імператарскім двары і выкананні асобных даручэнняў манарха, пазней – ганаровае званне.

[174] *Uruski S.* Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. Warszawa : Gebethner i Wolff, 1905. – T. II. – S. 252.

# Ігнацый Францавіч Шэбека




Ігнацый Францавіч Шэбека – кавалергард, камергер, стацкі саветнік.

Прадстаўнік шляхецкага роду Шэбекаў з Магілёўскай губерні.

Сын Франца Іванавіча Шэбекі, генерал-маёра расійскіх войск, памочніка дырэктара Пажаскага корпуса.

Служыў у Кавалергардскім палку. Пазней на грамадзянскай службе. Прайшоў шлях ад калежскага асэсара (8-ы клас Табеля аб рангах) да стацкага саветніка (5-ы клас Табеля аб рангах).

Ад пачатку 1830-х гадоў старшыня Магілёўскай губернскай палаты грамадзянскага суда[175]. Займаў гэту пасаду на працягу амаль двух дзесяцігоддзяў[176].

*Палаты грамадзянскага суда былі створаны ў адпаведнасці з губернскай рэформай 1775 года, уведзены ў Віцебскай і Магілёўскай губернях у 1831 годзе (у сувязі з адменай дзеяння Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года). З'яўляліся вышэйшай апеляцыйнай інстанцыяй па грамадзянскіх справах для судоў адпаведнай губерні.*

У 1834 годзе атрымаў ганаровае званне камергера двара Яго Імператарскай Вялікасці.

Ганаровы апякун Магілёўскай губернскай гімназіі, член Магілёўскага губернскага інвентарнага камітэта[177], дырэктар Магілёўскага губернскага апякунскага аб турмах камітэта[178].

Быў узнагароджаны Ордэнамі Святой Ганны 3 ступені (1823 год), Святога Станіслава 2 ступені (1839 год)[179].

---

175 Месяцослов и Общий штат Российской империи на 1832. Часть вторая. СПб. : Типография Имп. Акад. Наук, 1832. С. 339.

176 Адрес-календарь. Общая роспись всех чиновных особ в государстве, 1850. Часть I. – СПб. : Типография Имп. Акад. Наук, 1850. С. 3.

177 Адрес-календарь. Общая роспись всех чиновных особ в государстве, 1853. Часть I. – СПб. : Типография Имп. Акад. Наук. С. 13.

178 Памятная книжка Могилевской губернии на 1864 год. – Могилев : Типография Губернского Правления, 1864. С. 371.

У 1840 годзе быў узнагароджаны ад Імператарскага вольнага эканамічнага таварыства срэбнай вазай за выдатную якасць арнауткі (сорт пшаніцы з белым і цвёрдым зернем)[180].

Валодаў маёнткамі Лёзна і Рудня ў Аршанскім павеце, а таксама маёнткам Міхалінава ў Віцебскім павеце.

Быў жанаты з Елізаветай Сяргееўнай Трухачовай[181]. Меў з ёй пецярых дзяцей: Мікалая, Вольгу, Соф'ю, Варвару і Аляксандра.

*Мікалай Ігнацьевіч Шэбека нарадзіўся 27 снежня 1834 г. Служыў у Кавалергардскім палку. У 1871 годзе ўзведзены ў генерал-маёры і прызначаны губернатарам Бессарабіі. У 1887 годзе ўзведзены ў генерал-лейтэнанты і прызначаны таварышам міністра ўнутраных спраў, загадваў паліцыяй. У 1890 годзе прызначаны сенатарам. Ад 1895 года член Дзяржаўнага савета. У 1900 годзе ўзведзены ў генералы ад кавалерыі. Быў жанаты на Марыі Мікалаеўне Ганчаровай, пляменніцы Наталлі Ганчаровай (у першым шлюбе Пушкінай). Памёр 6 студзеня 1905 г. Пахаваны ў Ісідораўскай царкве Аляксандра-Неўскай лаўры.*

*Вольга Ігнацьеўна Шэбека нарадзілася ў 1836 годзе. У 1858 годзе пабралася шлюбам са Сцяпанам Аляксандравічам Гендрыкавым, праваздейным тайным саветнікам. Памерла ў 1904 годзе.*

*Соф'я Ігнацьеўна Шэбека нарадзілася ў 1838 годзе. У 1862 годзе пабралася шлюбам з Васіліем Міхайлавічам Далгарукавым, тайным саветнікам, губернатарам віцебскім у 1884-1894 гадах. Памерла ў 1910 годзе.*

*Варвара Ігнацьеўна Шэбека нарадзілася 1 лістапада 1840 года. Была кампаньёнкай і сяброўкай Кацярыны Міхайлаўны Далгарукавай (сваёй нявесткі), шматгадовай фаварыткі, а затым другой жонкі імператара Аляксандра II. Выконвала ролю пасрэдніка ў адносінах імператара і княгіні Далгарукавай. Прысутнічала на цырымоніі іх вянчання ў капліцы Царскасельскага палаца 6 ліпеня 1880 г. Была хроснай маці трох старэйшых дзяцей Аляксандра II і Кацярыны Далгарукавай. Сучаснікі абвінавачвалі Варвару Шэбека ў інтрыгах і карупцыі (яна аказвала ўплыў на імператара пры размеркаванні чыгуначных канцэсій, за што*

---

179 Список гражданским чинам шестого класса. СПб.: Типография II Отделения Собственной Е.И.В. Канцелярии, 1847. С. 214.

180 Сборник Императорского русского исторического общества. Том 62. – СПб.: Типография Н.А. Лебедева, 1888. С. 435.

181 Елізавета Сяргееўна Шэбека (Трухачова) памерла 12 кастрычніка 1893 г. у Парыжы ва ўзросце 82 гадоў. Пахавана на мясцовых могілках Баціньёль.

*атрымлівала буйныя сумы грошай). Памерла 30 сакавіка 1931 г. у Парыжы.*

Ігнацый Францавіч Шэбека вызнаваў каталіцтва[182].

Памёр у 1867 годзе. Верагодна, быў пахаваны ў маёнтку Лёзна[183].

Абставіны пераходу Лёзна ад Храпавіцкіх да Шэбекаў невядомыя. Ігнацый Францавіч Шэбека ўпершыню згадваецца як уладальнік мястэчка ў 1836 годзе[184]. Пасля яго смерці ў 1867 годзе маёнтак Лёзна ўспадкаваў малодшы сын Аляксандр.

---

[182] Памятная книжка Могилевской губернии на 1867 год. – Могилев : Типография Губернского Правления, 1867. С. 66.

[183] Сярод рэчаў, адабраных у маі 1921 года ў маёнтку Лёзна камісіяй для Віцебскага губернскага музея, была мармуровая надмагільная пліта Шыбекі – *Карпекін К.* Тут раней жылі паны / К. Карпекін // Сцяг Перамогі. – 2010. – 23 лют. – С. 3.

[184] Сборник Императорского русского исторического общества. Том 139. Акты, документы и материалы для истории 1812 года. Том 3. – СПб.: Типография А.Ф. Штольценбурга, 1912. С. 24.

## Аляксандр Ігнацьевіч Шэбека

Аляксандр Ігнацьевіч Шэбека – ротмістр, палкоўнік.

Нарадзіўся ў 1844 годзе. Малодшы сын Ігнацыя Францавіча Шэбекі, камергера і стацкага саветніка, і Елізаветы Сяргееўны Трухачовай.

Ротмістр Кавалергардскага палка. Ад 1873 года ад'ютант пры начальніку Галоўнага штаба Расійскай імператарскай арміі[185]. У 1874 годзе ўзведзены ў чын палкоўніка[186].

У 1878 годзе быў узнагароджаны ордэнам Святога Ўладзіміра 4 ступені. Меў таксама замежныя ўзнагароды: французскі афіцэрскі крыж Ордэна Ганаровага Легіёна (1877 год), аўстрыйскі Ордэн Жалезнай кароны (1878 год)[187].

Пасля 1885 года сышоў у адстаўку.

Вызнаваў праваслаўе.

Валодаў маёнткамі Лёзна і Рудня ў Аршанскім павеце[188], сумесна з братам Мікалаем – маёнткам Міхалінава ў Віцебскім павеце[189], якія атрымаў у спадчыну ад бацькі. У 1878 годзе набыў маёнткі Загоранка і Паўлаўка ў Чавускім павеце[190], Скоклева ў Быхаўскім павеце[191], Каркоўшчына, Рабяткі, Асінаўка, Бярозаўка і Альхоўка ў Чэрыкаўскім павеце[192].

У 1867-1868 гадах праз уладанні Аляксандра Ігнацьевіча Шэбекі ў Аршанскім павеце прайшоў участак Арлоўска-Віцебскай чыгункі. У ¼ вярсты ад мястэчка Лёзна была ўзведзена станцыя, якая атрымала назву Шэбекіна.

---

185 Адрес-календарь. Общая роспись начальствующих и прочих должностных лиц по всем управлениям в Российской империи на 1874. Часть I. – СПб. : Типография Правительствующего Сената. С. 119.
186 Адрес-календарь … на 1875. Часть I. … С. 121.
187 Спискъ полковникамъ по старшинству. Исправлено по 1-е сентября. – СПб. : Военная типография, 1879. С. 461.
188 Опыт описания Могилевской губернии / под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 3. – Могилев : Типография Губернского Правления, 1884. С. 176-177.
189 Памятная книжка Витебской губернии на 1878 год / сост. А. М. Сементовским. – Витебск.: Витебская губернская типография, 1878. С. 276.
190 Опыт описания Могилевской губернии ... Кн. 3. С. 232.
191 *Ibidem,* С. 58.
192 *Ibidem,* С. 256.




*Станцыя Шэбекіна перайменавана ў Лёзна 15 кастр. 1909 г.* [193].

У 1882 годзе браў удзел ва Ўсерасійскай мастацка-прамысловай выставе, якая праходзіла ў Маскве. Экспанаваў на ёй прадукцыю з уласных маёнткаў Лёзна, Рудня і Міхалінава: насенне лёну, французскі і венгерскі авёс.



*Усерасійская мастацка-прамысловая выстава 1882 года ў Маскве на Хадынскім полі. Літаграфія*

[193] Собрание узаконений и распоряжений Правительства, издаваемое при Правительствующем Сенате. 1911. Отдел первый. Второе полугодие. – СПб. : Сенатская типография, 1911. С. 51.

*Дзякуючы Паказальніку Ўсерасійскай мастацка-прамысловай выставы 1882 года, можна ўявіць структуру памешчыцкай гаспадаркі: "Усяго ў маёнтках Лёзна, Рудня (Магілёўская губ.) і Міхалінава (Віцебская губ.) 20 тыс. дзесяцін, з якіх лесу да 15 тыс. дзесяцін; севазварот пяціпольны; апрацоўка машынная; галоўны прадукт – азімае жыта, якое перакурваецца на ўласным заводзе, а з яравых – лён, якога высяваецца да 100 дзесяцін штогод; лес, пераважна яловы, эксплуатуецца выбарачнай рубкай, і прадукт сплаўляецца па Заходняй Дзвіне ці адпраўляецца па чыгунцы ў Рыгу"* [194].

Загадваў гаспадаркай маёнтка Лёзна аграном Якаў Лявонцьевіч Барахові́ч[195].

*Барахові́ч Якаў Лявонцьевіч – аграном і садавод. Навучаўся ў Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі, а таксама ва манскім вучылішчы земляробства і садаводства. Член-карэспандэнт Імператарскага Вольнага Эканамічнага Таварыства, член Віцебскага таварыства сельскіх гаспадароў. Вёў актыўную публіцыстычную дзейнасць*[196]*. Загадваў маёнткам Лёзна палкоўніка Аляксандра Ігнацьевіча Шэбекі больш за 12 год (прынамсі ад 1869 да 1881 года).*

У кастрычніку 1883 года Аляксандр Ігнацьевіч Шэбека прадаў маёнтак Лёзна Мікалаю Дзмітрыевічу Хлюсціну.

---

194 Указатель Всероссийской промышленно-художественной выставки 1882 года в Москве. М. : Издание Мартынова, 1882. С. 109-110.

195 Продолжение алфавитно-систематического каталога библиотеки Императорского Вольного Экономического Общества. 1865-1880. / сост. В. Э. Иверсен. – СПб. : Типография И. Леви, 1881. С. 418.

196 *Борохович Я.Л.* По вопросу о нашей торгово-промышленной политике (внешней и внутренней) в связи с вопросом о прогрессе и регрессе в деле сельского и лесного хозяйства : Доклад Всерос. торгово-пром. съезду в Москве, представленный уч. агрономом Я. Л. Бороховичем, в июле 1882 г. – СПб. : тип. А. С. Суворина, 1883. 44 с.

*Борохович Я.Л.* Причины регресса льноводства и льняной промышленности в России: к докладу, представленному Витебскому обществу сельских хозяев 12 марта 1890 года агрономом Я. Л. Бороховичем. – Витебск : Типолитография наследников М. Б. Неймана, 1892. 50 с.

*Борохович Я.Л.* Репа или турнепс (Brassica rapa rapifera L, seu B. napus esculentus. Dc.): репа жнивная (Stoppelrübe): садовая и полевая (пищевая и кормовая), как спасительное средство во время неурожая хлебов и голода: доклад Витебскому обществу сельских хозяев Я. Л. Бороховича. – Витебск : Типолитография наследников М. Б. Неймана, 1893. 27 с.

*Борохович Я.Л.* Политика Англии как источник мировых бедствий. Причины и последствия трансваальского денежного кризиса в Европе, индийского голода и распространение чумы. Смоленск, 1900, 86 с.

Памёр 6 студзеня 1929 года ў Парыжы. Пахаваны на мясцовых могілках Баціньёль[197].

[197] Незабытые могилы : Российское зарубежье : некрологи 1917-2001 : В 6 т. Т. 6. Кн. 3. Х-Я. / Рос. гос. б-ка; Под. Ред. Е.В. Макаревич. – М., издательство «Пашков дом», 2007. С. 333.

## Мікалай Дзмітрыевіч Хлюсцін

Мікалай Дзмітрыевіч Хлюсцін – патомны дваранін, надворны саветнік.

Нарадзіўся ў 1860 годзе. З рускіх дваран Тульскай губерні. Сын Дзмітрыя Міхайлавіча Хлюсціна, падпаручніка, калежскага саветніка, і Варвары Мікалаеўны Лазарэвіч.

Навучаўся ў Імператарскім Аляксандраўскім ліцэі (назва Царскасельскага ліцэя пасля пераезду ў Санкт-Пецярбург), які скончыў у 1878 годзе (36-ы выпуск)[198].

Ад снежня 1878 служыў у Дзяржаўнай канцылярыі (Канцылярыі Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі). Прайшоў шлях ад тытулярнага саветніка (IX клас) да надворнага саветніка (VII клас). У чэрвені 1885 года сышоў у адстаўку[199].

У 1883 годзе набыў маёнтак Лёзна ў Аршанскім павеце Магілёўскай губерні[200]. Валодаў таксама маёнткамі Міхалінава ў Віцебскім павеце, Казьяны ў Гарадоцкім павеце Віцебскай губерні[201]. Ад бацькі Дзмітрыя Міхайлавіча Хлюсціна атрымаў маёнтак пры сяльцы Прадцечанскім[202] у Лівенскім павеце Арлоўскай губерні[203].

Стала пражываў у маёнтку Лёзна (сядзібны дом і гаспадарчыя пабудовы размяшчаліся на тэрыторыі сучаснай вёскі Адаменкі).

Вызнаваў праваслаўе. З’яўляўся сябрам Магілёўскага царкоўнага багаяўленскага брацтва[204]. Быў старастай, старшынёй прыходскага апякунскага савета Свята-Узнясенскай царквы ў мястэчку Лёзна.

---

198 Памятная книжка Императорскаго Александровскаго лицея на 1880 год. – СПб. : Типография Р. Голике, 1880. С. 139.

199 Опись делъ архива Государственнаго совета. – Том 16. – Дела Государственнаго совета и Государственной канцелярии с 1807 по 1910 года. - СПб. : Государственная типография, 1912. С. 796.

200 *Карпекін К.* Французскія раманы Мікалая Хлюсціна, альбо Найбагацейшы землеўладальнік Лёзненскай воласці [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.lioznonews.by/history/французскія-раманы-мікалая-хлюсціна/. – Дата доступа: 10.09.2022.

201 Вестник финансов, промышленности и торговли. – 1902, 6 (19) октября. – № 40. – Особое прибавление. С. 6.

202 Сёння Прадцечаўка (Предтечевка) – вёска ў Волаўскім раёне Ліпецкай вобласці Расіі.

203 *Ibidem,* С. 38.

204 Могилёвские епархиальные ведомости. – 1898, 11-21 марта. – № 8-9. – С. 71.

Намаганнямі Мікалая Дзмітрыевіча Хлюсціна вакол царквы была пабудавана металічная агароджа. Займаўся разбудовай храма, актыўна ахвяраваў на гэта ўласныя грошы. Менавіта ў доме Хлюсціных спыняўся епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Місаіл падчас наведвання Лёзна ў 1899 годзе[205].

Браў актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці рэгіёна. Быў сябрам Віцебскага губернскага камітэта аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці[206], сябрам Смаленскага аддзялення Дзяржаўнага дваранскага зямельнага банка (па выбары ад дваранства Віцебскай губерні)[207], старшынёй праўлення Лёзненскага пажарнага таварыства[208].

У 1915 годзе дэпутат Дваранскага дэпутацкага сходу Магілёўскай губерні ад Аршанскага павета[209].

Быў жанаты з Марыяй Сцяпанаўнай Кухарэнка, дачкой Сцяпана Якаўлевіча Кухарэнкі, генерал-маёра Кубанскага казацкага войска. Меў з ёй сыноў Дзмітрыя і Міхаіла.

*Дзмітрый Мікалаевіч Хлюсцін. Нарадзіўся ў 1891 годзе. Навучаўся ў Імператарскім Аляксандаўскім ліцэі (67-ы выпуск 1911 года). Калежскі сакратар. Прылічаны да Міністэрства юстыцыі з накіраваннем у Грамадзянскі касацыйны дэпартамент Урадавага Сената[210]. Ад 1915 ці 1916 года маршалак шляхты (рас. предводитель дворянства) Наваград-Валынскага павета Валынскай губерні[211]. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года – наваград-валынскі павятовы камісар Часовага ўрада[212].*

---

205 Путевые заметки при обозрении церквей Могилевской епархии Преосвященнейшим Мисаилом, епископом Могилёвским и Мстиславским, в 1899 году // Могилёвские епархиальные ведомости. – 1899, 11 ноября. – № 32. – С. 469-471.

206 Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. Том V. Витебская губерния. – С.-Пб. : Типография В. Киршбаума, 1903. С. 1., 27-30, 101-103.

207 Памятная книжка Смоленской губернии на 1907 год. Издание Смоленского губернского статистического комитета. – Смоленск : Тип. П.А. Силина, 1907. С. 36.

208 Памятная книжка Могилевской губернии на 1915 год. – Могилев : Губернская типография, 1915. С. 10.

209 *Ibidem,* С. 195.

210 Памятная книжка лицеистов. Издание собрания курсовых представителей Императорского Александровского лицея. – С.-Пб. : Типография Министерства внутренних дел, 1911. С. 190.

211 Памятная книжка Волынской губернии на 1917 год. – Житомир: Волынский губернский статистический комитет, 1916. С. 242.

212 Борьба трудящихся Волыни за власть Советов : март 1917 г. – декабрь 1920 г. : сборник документов и материалов. – Житомир : Житомирское областное издательство, 1957. С. 60.

*Расстраляны бальшавікамі ў перыяд паміж лютым і жніўнем 1919 года ў Кіеве[213]. Не жанаты.*

*Міхаіл Мікалаевіч Хлюсцін. Нарадзіўся ў 1895 годзе. Навучаўся ў Імператарскім Аляксандаўскім ліцэі (71-ы выпуск 1915 года). Чыноўнік асобых даручэнняў пры валынскім губернатары, калежскі сакратар. Пражываў у гасцініцы "Францыя" на Кіеўскай вуліцы ў Жытоміры[214]. У 1929 годзе знаходзіўся ў эміграцыі ў Бялградзе[215]. Далейшы лёс невядомы.*

У лістападзе-снежні 1917 года перадаў маёмасць маёнтка Лёзна прадстаўнікам мясцовага валаснога выканаўчага камітэта[216].

Лёс Мікалая Дзмітрыевіча Хлюсціна пасля 1917 года невядомы.

[213] Киевлянинъ. – 1919, 31 августа. – № 9. – С. 1.
[214] Памятная книжка Волынской губернии на 1917 год … С. 233.
[215] Памятная книжка лицеистов за рубежом. Издание объединения б. воспитанников Императорского Александровского лицея во Франции. – Париж, 1929. С. 113.
[216] *Карпекін К.* Французскія раманы Мікалая Хлюсціна … .

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Гісторыя Лёзна незвычайна багатая на яскравыя падзеі і таленавітых людзей. Неад'емнай яе часткай з'яўляецца гісторыя ўладальнікаў населенага пункта.

Лёзна ўзнікла на землях Мікулінскай воласці не пазней за XVI стагоддзе. Першым вядомым уладальнікам гэтых зямель быў князь Міхаіл Іванавіч Асавіцкі. Вядома, што ён атрымаў Мікулінскую воласць як выслугу (дараванне за службу вялікаму князю на перыяд жыцця атрымальніка) яшчэ да 1514 года. Пасля смерці Міхаіла Іванавіча Асавіцкага каля 1546 года права валодання Мікуліным было захавана за яго жонкай Аграфенай Андрэеўнай Лукомскай, і толькі пасля яе смерці ў канцы 1554 ці пачатку 1555 года воласць была вернута вялікаму князю.

Ужо ў сакавіку 1555 года Жыгімонт ІІ Аўгуст перадаў Мікулін Астафію Багданавічу Валовічу. Ён трымаў воласць да сваёй смерці ў снежні 1587 года, пасля чаго ўладальніцай маёнтка стала яго адзіная дачка і спадчынніца Раіна (Рэгіна) Астаф'еўна Валовіч.

Пасля смерці Раіны (Рэгіны) Астаф'еўны Валовіч у чэрвені 1591 года Мікулін трапіў ва ўладанне віцебскага кашталяна Марціна Янавіча Стравінскага. З гэтым, аднак, не пагадзіліся родныя пляменнікі Астафія Багданавіча Валовіча – Раман і Пётр Грыгор'евічы Валовічы. Яны гвалтоўна захапілі маёнтак у красавіку 1593 года.

У хуткім часе браты Раман і Пётр Грыгор'евічы Валовічы прадалі Мікулін сваёй сястры Раіне (Рэгіне), якая ўнесла яго мужу Багдану Мацвеевічу Агінскаму.

Каля 1625 года з маёнтка Мікулін было вылучана асобнае ўладанне – маёнтак Лёзна, гаспадаром якога стаў малодшы сын Багадана Мацвеевіча Агінскага – Самуэль.

Самуэль Багданавіч Агінскі прыняў належныя меры па развіцці новага маёнтка: збудаваў панскі двор і ўзвёў мястэчка Лёзна. Пасля яго смерці ў 1657 годзе маёнтак Лёзна перайшоў да старэйшага сына Шымана Караля Агінскага.

Пасля смерці Шымана Караля Агінскага ў 1699 годзе ўладанне было падзелена паміж трыма яго сынамі: Багуславам, Марцыянам і Аляксандрам. Уладальнікам часткі маёнтка з мястэчкам Лёзна стаў Багуслаў Казімір Агінскі. Яго адзіны сын Караль памёр яшчэ пры жыцці бацькі ў 1716 годзе, таму маёнтак Лёзна ў 1730 годзе ўспадкаваў унук Юзэф Агінскі. Пасля смерці Юзэфа Агінскага ўладальнікам маёнтка

Лёзна стаў яго адзіны сын Ігнацый. Неўзабаве пасля смерці Ігнацыя Агінскага ў 1787 годзе, яго сястра Магдалена ўнесла маёнтак Лёзна мужу Юзэфу Храпавіцкаму. Такім чынам, пасля 1790 года маёнтак Лёзна перайшоў ва ўладанне роду Храпавіцкіх.

Юзэф Храпавіцкі памёр у пачатку 1812 года, пасля чаго маёнтак Лёзна стаў уласнасцю трох яго сыноў: Антонія, Міхаіла і Яўстафія.

У пачатку 1830-х гадоў Лёзна перайшло ва ўладанне Ігнацыя Францавіча Шэбекі, а пасля 1867 года – яго сына Аляксандра Ігнацьевіча Шэбекі.

Апошнім уладальнікам Лёзна быў рускі дваранін Мікалай Дзмітрыевіч Хлюсцін. Менавіта ён валодаў маёнткам ад 1883 года да 1917 года.

Прыватнаўласніцкая гісторыя Лёзна скончылася ў снежні 1917 года, калі маёнтак быў перададзены органам новай улады.